Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 МАЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 93 (29973)

КАБ СВЯТА ЗАПОМНІЛАСЯ

Сямейная газета

ЯК ШУКАЦЬ ЗГУБЛЕНАГА ГАДАВАНЦА?

Сямейная газета

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ДАРАХОВІЧ, першы намеснік міністра спорту і турызму:

«Летась на буйных міжнародных спаборніцтвах беларускімі спартсменамі было заваявана 213 медалёў, а ў бягучым годзе па стане на сёння — 64 медалі. Гэта, вядома, вельмі мала, паколькі адносна нашага спорту захоўваюцца абмежаванні. Дапускаць беларусаў да міжнародных стартаў ужо дазволілі 19 федэрацый па 20 відах спорту. Вельмі разлічваем, што санкцыі ў хуткім часе будуць зняты, у поўным аб'ёме будуць дапушчаны ўсе федэрацыі і Беларусь паўнацэнна вернецца на міжнародную арэну».

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў тэлефоннай размове асабіста павіншаваў Прэзідэнта Казахстана Касым-Жамарта Такавева з 70-годдзем і абмеркаваў супрацоўніцтва з Казахстанам.**
- Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 138, якім карэкціруецца парадак выкарыстання маёмасці, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, і парадак вызначэння памеру арэндай платы пры здачы яе ў арэнду.
- **ВУП Беларусі ў студзені — красавіку 2023 года склаў Br63,5 млрд.**
- У Беларусі абновяць рэкамендацыі адносна прафілактыкі распаўсюджвання COVID-19 у аздараўленчых лагерах.
- **Дадатковы цягнік будзе курсіраваць паміж Віцебскам і Масквой у дні «Славянскага базару».**

ISSN 1990 — 763X

Бяспека

ВІЗІТНАЯ КАРТКА АЙЧЫННАГА ВАЕННПРАМА

Пачала работу XI Міжнародная выстаўка ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2023

Каторы год запар «Мінск-Арэна» становіцца пляцоўкай для прэзентацыі тэхнічных навінак, навуковых даследаванняў і інавацыйных тэхналогій як айчыннага ваенна-прамысловага комплексу, так і ВПК краін-партнёраў. Сёлета побач з беларускімі ўзорамі экспануецца прадукцыя абароннага сектара з Расіі, Кітая і Ірана. Сярод найноўшых машын і сістэм, прыбораў і абсталявання, прадстаўленых на папулярнай выставачнай пляцоўцы, можна ўбачыць і тыя распрацоўкі, якія ўжо атрымалі міжнароднае прызнанне, а адпаведна, актыўна выкарыстоўваюцца вядучымі арміямі свету.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Канкурэнтаздольная і запатрабаваная прадукцыя

Падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця XI Міжнароднай выстаўкі ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2023 прывітанне ўдзельнікам і гасцям прадстаўнічага форуму ад імя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі агучыў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** У прывітальным слове акцэнтавана ўвага на тым, што на гэты раз інтэрнацыянальны зброевы салон праходзіць у год 20-годдзя Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта. «Таму беларуская частка экспазіцыі стане своеасаблівай дэманстрацыяй самага перадавога, што зроблена айчынным абаронным сектарам, у тым ліку з выкарыстаннем высокіх тэхналогій і штучнага інтэлекту, а таксама інавацыйнай грамадзянскай прадукцыі, якая з'явілася дзякуючы дыверсіфікацыі некаторых вытворчасцяў», — адзначаецца ў прывітанні.

Як звярнуў увагу ў сваім выступленні Аляксандр Вальфовіч, ваенная гісторыя дзяржавы навучыла нас цаніць мір і бяспеку як адну з абавязковых умоў пазітыўнага развіцця грамадства. Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі лічыць сімвалічным, што мерапрыемства праходзіць напярэдадні важнай гістарычнай падзеі — 80-годдзя пачатку вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

СТАР. 4

Вы прасілі расказаць

НАШ МІНІМАЛЬНЫ НАБОР

Некалькі наіўных пытанняў аб спажывецкім кошыку

У нас на слыху нярэдка бывае выраз «спажывецкі кошык». Але навошта ён патрэбны і што ў яго ўваходзіць, ведаюць далёка не ўсе. Больш за тое, існуе маса памылковых меркаванняў адносна такога «кошыка». Паспрабуем адказаць на самыя простыя пытанні.

НАВОШТА ЯГО ПРЫДУМАЛІ?

Спажывецкі кошык — гэта пералік прадуктаў, рэчаў і паслуг першай неабходнасці, які ў нашай краіне зацвярджаецца Міністэрствам працы і сацабароны. Паколькі ў «кошык» уваходзяць тавары і паслугі першай неабходнасці, часта кажуць — «мінімальны спажывецкі кошык». Склад «кошыка» пераглядаецца раз на пяць гадоў, а вось бюджэт пражытковага мінімуму — раз на квартал, бо цэны на тавары і паслугі таксама мяняюцца.

Прасцей кажучы, навукоўцы падлічваюць, колькі калорый трэба чалавеку для нармальнай жыццядзейнасці і з якіх прадуктаў іх атрымаць, а чыноўнікі — колькі для гэтага трэба грошай.

СТАР. 13

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

У духу дружбы і ўзаемаразумення

Казахстан заўсёды быў і застаецца для Беларусі надзейным партнёрам

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся са старшынёй Мажыліса Парламента Рэспублікі Казахстан Ерланам КАШАНАВЫМ і дэпутатамі, абранымі ў новы склад Мажыліса. Дэлегацыя Казахстана прыехала ў Беларусь для ўдзелу ў выязным пасяджэнні Савета Парламенцкай асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Уладзімір Андрэйчанка павіншаваў Ерлана Кашанава з паспяховага праведзенымі выбарамі дэпутатаў у Мажыліс Парламента. Ён пажадаў казахстанскаму калегу паспяховай работы і моцнага здароўя. «Рэспубліка Казахстан для Рэспублікі Беларусь заўсёды была і застаецца надзейным партнёрам. Мы зацікаўленыя ў тым, каб нашы адносіны развіваліся ў духу дружбы, узаемаразумення, узаемавыгаднага супрацоўніцтва. Вялікую ролю адыгрываюць міжпарламенцкія сувязі», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. Ён падкрэсліў, што сёння Беларусь перажывае няпросты перыяд, каля нашых граніц ідзе вайна, супраць Беларусі прыняты неабгрунтаваныя санкцыі з боку Захаду і Злучаных Штатаў Амерыкі.

«Хочацца, каб тая палітыка, якую праводзяць заходнія краіны, ніякім чынам не адбілася на нашых ганджлёва-эканамічных адносінах, супрацоўніцтве ў адукацыі і ахове здароўя, культуры і навуцы. Кірункаў нашага супрацоўніцтва яшчэ вельмі шмат. Я лічу, што ў нас непачаты край работы ў міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Мы настроеныя і надалей у поўнай меры развіваць супрацоўніцтва з Рэспублікай Казахстан», — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Як адзначыла ў размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Святлана ЛЮБЕЦКАЯ**, міжпарламенцкае ўзаемадзеянне — важны элемент дзяржаўнай палітыкі. Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь усяляк вітае ўзаемадзеянне з парламентамі іншых краін. Яна расказала, што на сустрэчы з прадстаўнікамі Мажыліса

Фота БелТА.

абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння парламентарыяў дзвюх краін. Па яе словах, узаемадзеянне выбраннікаў народаў дазваляе вырашаць пытанні эканамічнага, культурнага, адукацыйнага супрацоўніцтва. «Кожная дзяржава імкнецца да павышэння якасці жыцця свайго народа і павышэння яго дабрабыту. І гэта галоўная мэта такіх сустрэч, паколькі тыя, хто прадстаўляе людзей, лепш ведаюць іх праблемы. Сёння Казахстан — гэта найважнейшы стратэгічны партнёр у сферы эканомікі, міжкультурнага ўзаемадзеяння, таму тая ўвага, якая ўдзяляецца нашаму супрацоўніцтву з боку кіраўнікоў дзяржаў і парламентарыяў, цалкам абгрунтаваная», — адзначыла старшыня пастаяннай камісіі.

Святлана Любецкая расказала, што вынікі такой работы ёсць. На пляцоўцы парламента створана рабочая група дружбы, у рамках якой вядзецца дадатковая работа па вывучэнні сфер, што цікавяць нашы бакі, і праводзяцца пэўныя мерапрыемствы.

«Маюць важнае значэнне пытанні, якія неабходна вырашаць у рамках заканадаўства нашых краін. Казахстан перажывае этап канстытуцыйнага будаўніцтва, у Беларусі летась прайшоў канстытуцыйны рэферэндум, унесены істотныя змяненні ў заканадаўства. І вось такі абмен досведам у развіцці прававых сістэм складае вялікую цікавасць», — сказала Святлана Любецкая.

Валерыя СЦЯЦКО.

Ва ўрадзе

Сітуацыя ў эканоміцы стабільная

У краіне дасягнуты рэкордна высокі ўзровень сярэдняй зарплаты

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ў час пасяджэння Савета Міністраў, прысвечанага падвядзенню вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў першым кварталe 2023 года.

«Агульная сітуацыя ў эканоміцы стабільная, вынікі маюць устойлівую станоўчую тэндэнцыю. Захавана макраэканамічная збалансаванасць, дадатнае сальда знешняга гандлю за першы квартал — каля $243 млн. Аб'ёмы экспарту тавараў і паслуг за студзень — сакавік бягучага года склалі $11,7 млрд. Гэта максімальны паказчык за апошнія 10 гадоў», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Ён дадаў, што дзякуючы мерам урада і Нацыянальнага банка інфляцыя ў гадавым выражэнні за чатыры месяцы бягучага года знізілася да 4,7 працэнта.

У поўным аб'ёме выконваюцца і сацыяльныя задачы дзяржавы. «Мы выйшлі на станоўчы тэмп росту рэальных даходаў насельніцтва, які за першы квартал 2023 года перасягнуў 100 працэнтаў. Рэальная заработная плата вырасла амаль на два працэнты. Сярэдняя зарплата ў студзені — сакавіку склала Br1731, або $627, што з'яўляецца рэкордным паказчыкам для Беларусі», — дадаў ён.

Паляпшаюцца і паказчыкі па пенсійных выплатах. «У маі з улікам апошняга павышэння сярэдняя пенсія складзе Br705, што на 21 працэнт больш у параўнанні з маем мінулага года», — удакладніў Раман Галоўчанка.

Перад пасяджэннем Саўміна **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** расказаў журналістам: «Эканоміка працягвае аднаўленчую дынаміку, як і плануавалася, працягваецца штомесячны прырост у сярэднім на 1,5 працэнтнага пункта. Прырост адзначаецца практычна ва ўсіх галінах».

Міністр растлумачыў, што ў пачатку года быў поўнасцю адноўлены прамысловы комплекс — тэмп росту за чатыры месяцы гэтага года склаў 102,3 працэнта. «Прырастае і сельская гаспадарка — 103,7 працэнта. Поўнасцю адноўлены рознічны і знешні гандаль. За тры месяцы мы прыраслі на 8 працэнтаў і атрымалі $11,7 млрд экспартнай выручкі, гэта максімальны аб'ём за апошнія дзесяць гадоў», — дадаў ён.

Аляксандр Чарвякоў сказаў, што самы галоўны вынік работы першага квартала бягучага года — аднаўленне рэальных грашовых даходаў насельніцтва: «Зарплата ў рэальным выражэнні вырасла на 1,7 працэнтнага пункта, пенсіі — на 9 працэнтаў і даходы ў цэлым — на 0,3 працэнта. Гэта асноўны вынік работы эканомікі».

Паводле БелТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий Агросервис» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ СТОЛОВОЙ

***(составные части и принадлежности: хозпостройка)* общей площадью 316,2 кв. м с инв. № 640/С-26850, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624681302601000698 (право аренды по 30.11.2070) площадью 0,1822 га по адресу: Минская область, Слуцкий район, Весейский с/с, аг. Весея, ул. Шоссейная, 1Б.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0201 га; придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, пл. 0,0194 га.

Объект обременен договором аренды по 26.10.2024.

Начальная цена с НДС (20 %) – **85 020,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **8 502,00** бел. руб.

Начальная цена снижена на 35 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 11.11.2022, 14.01.2023, 02.03.2023, 15.04.2023.

Аукцион состоится **30.05.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.05.2023** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра (8044) 545 37 36.

УНП 690043986

Па сутнасці

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Нашых дзяцей выхоўвалі і намагаюцца выхоўваць. На жаль, не толькі бацькі, настаўнікі ды ўвогуле нераўнадушныя і добрыя людзі, дзяржава. Нашых дзяцей выхоўвалі і спрабуюць выхоўваць тыя, хто прагне намі ўладарыць. Як уладараць прамысловымі і гандлёвымі рынкамі суседніх дзяржаў Балтыі альбо сэрцамі і галовамі суседзяў-украінцаў. Калі мы ўсю моц нашай краіны і грамадства не накіруем на выхаванне моладзі, то ўсё астатняе будзе марна.

...Карціна амаль гэтых дзён. Нядзельны настрой і сапраўднае майскае надвор'е на вуліцах сталіцы. Па галоўнай артэрыі па графіку рухаецца аўтобус-«сотка». У салоне шмат людзей з маленькімі дзецьмі. Стаіць маленькая такая інтэлігентная жанчына, мабыць, настаўніца ў мінулым, а насупраць сядзіць малады хлопец. Што называецца — сустрэча пакаленняў. Яна стаяла, а ён сядзеў. Стаяла прадстаўніца таго пакалення, якое адбудоўвала пасляваенную Беларусь, «узяло» цаліну і космас. Таго, што не дало разгубіцца краіне і грамадству, калі мы аказаліся на геапалітычным перакрыжаванні 1990-х. Ён сядзеў — як і ўсё маладое пакаленне. На ўсім гатовым. Моднік знайшоў словы апраўдання: «А чаго вы не сказалі, каб месца ўступіў?»

Так, мы шмат што не сказалі нашай моладзі. І ўжо якое пакаленне запар. У 1990-я акцябраты і піянеры — сышлі ў гісторыю, камсамол — запэцкалі брудам. Школа сышла з дыстанцыі ідэйнага выхавацеля. А бацькі? А што бацькі — у іх з-пад ног таксама выбілі глебу іх жа ідэалаў. Бацькі з торбамі стаялі ў чэргах па «дэфіцыт» альбо ў якасці чаўнакоў на мяжы з Польшчай. Вось і атрымалася тое пакаленне — пакаленнем матэрыяльных інтарэсаў. А ўжо потым тое пакаленне выхоўвала іншае. У 2020-х — калі краіна была ўжо накормленая. Калі бацька ў хаце — дзеці не бядуюць. Але ж сытым пакаленням падавай каштоўнасці па набліжаных да Захаду мадэлях выхавання. І ў медыя, і ў школе, а пасля — і праз сацыяльныя сеткі. Так, ёсць і пазітыўныя моманты. Але шмат што насцярожвае, менавіта таму трэба крычаць «ратуйце».

Таму што выхавалі закаваных у ідэалагічныя англіцызмы касмапалітаў, якія далёкія ад працы сваімі рукамі (нельга не тое што на ўборцы бульбы, а і нават у школьным агародчыку задзейнічаць). Яны больш прывыклі сядзець — на плячах бацькоў, дзяржавы і ў аўтобусах побач са сталымі людзьмі. Выхавалі «індывідуумаў», якім усе і ўсё «завінаваціліся». Бацькі і дзяржава. З аднаго боку дзеці павінны жыць лепш за бацькоў. З іншага — яшчэ Біблія папярэджвала: не стварайце са сваіх дзяцей куміраў, бажкоў, бо яны будуць расці і патрабаваць усё больших ахвяр. І бацькі для іх — «саўкі ды калгаснікі», і дзяржава — тая, што паставіла на крылы, — ненавісная, бо не дапасуецца да гаджэтаў самай апошняй мадыфікацыі.

Шчокі надзьмула і тупае нагамі дзіця, якое патрабуе ад бацькоў новую цацку. Карціна не вельмі прывабная, калі тому малечы гадоў пяць-шэсць. А калі яму 20 гадоў і ён ужо «гуляе ў палітыку»?

Згушчаць хмары на светлым майскім небе не буду. Хапае ў нас і адэкватнай моладзі. Патрыятычнай і паважлівай, бо засталася ў нас у памяці, на дзяржаўным і ментальным узроўні Вялікая Перамога. Але ці засталася яна ў галаве і сэрцы новага пакалення? Каб апраўдаць іх інфантыльнасць і абыякавасць, заходнія сацыёлагі распрацавалі розныя найменні ды літары для вызначэння розных пакаленняў. Пачакайце! Тысячы гадоў жылі без гэтых штучных падзелаў. Маўляў, так імкліва яшчэ не развівалася цывілізацыя. Ды чаго вартае тое развіццё, калі чалавечнасць і біблейскі чалавек аб'яўленыя па-за палітычным, ідэалагічным, сацыяльным, нават гендарным мэйнстрымам? Мы куды накіроўваемся? Насамрэч — куды накіроўвае сябе і дзяржаву пакаленне, якое не ведае, у гонар каго названа яго родная вуліца? Не ведае, нават калі гэта Жукаў, Кіжаватаў, Ракасоўскі...

Таму не трэба здзіўляцца, што ў галовах «пакалення вапнільнага латэ» — «шляхетнасць» і «еўрапейскасць». Праўда, у перайначаным, постмадэрновым разуменні. Бо ад пачатку еўрапейскасць — гэта не канфармізм, не гіперіндывідуальнасць, гэта — самаахвярнасць, гэта — паслухмянасць бацькам і ўменне ўзяць чужы боль. Ды і сапраўднае шляхецтва — гатоўнасць загінуць за Радзіму і род. І «пагоня»— не сімвал беглых калабарантаў з неакаланіялістамі, а вершнік, што імчыць супраць юдаў свайго народа, роду, Радзімы.

Дзякуй богу, у беларускіх школах не выкладаюць «гендарныя перспектывы». Але налепак фонду USAID яшчэ хапае ў адукацыйных установах. І садраць іх са сцен значна лягчэй, чым з самасвядомасці нашай моладзі. Дзіцячая псіхіка «ў зубах» хагі-вагі. «Ювеналка», «хэлаўіны», дні валянцінаў — і вось ужо «руліць» інстытут сям'і без роду і племені, а цяпер яшчэ і без полу. А «балонскія працэсы» бяруць на мушку інстытут дзяржавы.

Але пакуль у нас Радуніца і Дзяды, пакуль на вопратцы і ў сэрцы стужкі колеру Дзяржаўнага сцяга з яблыневым цветам — сімвал таго, што «Беларусь памятае», а ў хаце сапраўдны Бацька — ёсць усе магчымасці для таго, каб капрызлівыя дзеці даралі да сапраўдных патрыётаў сваёй Радзімы.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Кухараву Уладзіміру Яўгенавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Імпартазамяшчэнне

ІЗАТОПЫ І АБСТАЛЯВАННЕ

Эксперты пра беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў ядзернай медыцыне

Методыкі прамянёвай тэрапіі, выкарыстанне радыефармпрэпаратаў, вытворчасць рэактарных медыцынскіх ізатопаў... Гэтыя і іншыя пытанні сталі тэмай сустрэчы экспертаў Беларусі і Расіі ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, дзе спецыялісты абмеркавалі шляхі ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва ў галіне ядзернай медыцыны і на лакальным рынку абсталявання і медыцынскіх паслуг. У прыватнасці, дзеля павышэння ўзроўню аказання медпаслуг у Беларусі і Саюзнай дзяржаве эксперты галіны разглядаюць магчымасць будаўніцтва чатырох медыцынскіх аб'ектаў «пад ключ» з выкарыстаннем найбольш сучасных медтэхналогій Саюзнай дзяржавы і пры яе фінансаванні.

Запатрабаванае і найлепшае на карысць пацыентаў

Адна з асноўных мэт галіны аховы здароўя Беларусі — дасягненне тэхналагічнага суверэнітэту ў галіне медыцыны, для чаго патрэбнае перааснашчэнне анкалагічных цэнтраў неабходным высокатэхналагічным абсталяваннем з выкарыстаннем найлепшых інавацыйных рашэнняў Саюзнай дзяржавы. Супрацоўніцтва ў гэтай сферы стала адной з тэм, якія абмяркоўваліся на семінары.

Для рэалізацыі буйных праектаў «Расатам» заўжды шукае лакальных партнёраў (дзяржпрадпрыемствы або прыватныя структуры). Цяпер базавы партнёр знойдзены, і пілотныя праекты па супрацоўніцтве з Беларуссю ў галіне ядзернай медыцыны, якія будуць рэалізоўвацца найперш, знаходзяцца на адборы ў кіраўніцтва ведамства. Аднак пакуль дакладны пералік рашэнняў прапрацоўваецца, заўважыў **Станіслаў ЛЯВІЦКІ, дырэктар краінавага офіса Дзяржкарпарацыі «Расатам» у Беларусі**:

— Пры рэалізацыі праектаў абавязкова будзе ўлічвацца баланс інтарэсаў абедзвюх краін, будзе выбудоўвацца схема ўзаемадзеяння. Вытворчая кааперацыя, якая будзе дасягнута ў выніку будаўніцтва медыцынскай інфраструктуры на тэрыторыі Беларусі, пазней стане асновай рэалізацыі сумесных праектаў у трэціх краінах.

Сёння для дыягностыкі і лячэння вельмі запатрабаваныя ізатопныя тэхналогіі, і той набор, які цяпер маецца ў цэнтры, недастатковы, бо хочацца далейшага развіцця. «Расатам» здольны яго забяспечыць, пабудаваўшы прадпрыемствы з сучаснымі медыцынскімі тэхналогіямі, што таксама абмяркоўвалася на сустрэчы, падзяліўся **Сяргей ПАЛЯКОЎ, дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава**:

— Новыя тэхналогіі радыефармбізнесу імкліва развіваюцца, і мы ведаем пра існаванне пэўных прадуктаў, аднак пакуль не можам іх атрымаць з-за пэўных абставін, якія склаліся, найперш з-за складанай лагістыкі, што існуе. І мы, а перш за ўсё — нашы пацыенты, павінны быць абароненыя, калі людзям патрабуюцца пэўныя ізатопы для дыягнастычных і лячэбных працэдур.

Другі кірунак беларуска-расійскага супрацоўніцтва — абсталяванне, якое стварае «Расатам». Існуюць пэўныя праблемы ў пастаўцы запасных частак да абсталявання, якое працуе ў цэнтры, дадаў дырэктар РНПЦ:

— Мы хочам развіваць новыя тэхналогіі і атрымліваць апараты для фармсінтэзу тут, на месцы. І тэхналогіі, якія нам прапануе «Расатам», будуць вельмі карысныя. Важна, каб абсталяванне і прэпараты, што ствараюцца, былі запатрабаваныя і найлепшыя.

Паўнапраўнае партнёрства і тэхнічны суверэнітэт

Пасля семінара было падпісана пагадненне аб стратэгічным супрацоўніцтве ў сферы ядзернай медыцыны паміж таварыствам «Русатам Хэлскеа», таварыствам «ЕўраФармІнтэграцыя», таварыствам «Расійскі экспартны цэнтр» і краінавым офісам Дзяржкарпарацыі «Растам» у Беларусі («Русатам Бел»).

Падпісаннем дакумента быў створаны эфектыўны інструмент, якім могуць карыстацца не толькі Беларусь і Расія, але і любая іншая краіна. Ён аб'яднаў у сабе кампетэнцыі «Расатама» як моцнага гульца ў галіне развіцця ядзерных тэхналогій і аховы здароўя, цяжкага медыцынскага прыборабудавання, упэўнены **генеральны дырэктар таварыства «Русатам Хэлскеа» Ігар АБРУБАЎ**:

— Сёння мы ўжо маем партнёрскія зносіны з шэрагам прадпрыемстваў Беларусі ў сферы выраб нашага медыцынскага абсталявання. За апошнія два месяцы гэта ўжо другое мерапрыемства з удзелам медыцынскіх суполак абедзвюх краін, каб стварыць магчымыя падыходы для паляпшэння тых прадуктаў, што ўжо з'яўляюцца на рынках, а таксама выпрацаваць сумесныя рэкамендацыі па лячэнні тых ці іншых захворванняў. Паралельна мы адразу разглядаем, якія існуюць магчымасці і патэнцыял у прадпрыемстваў нашых дзяржаў, каб выкарыстоўваць іх максімальна эфектыўна ў абсталяванні, якое ствараецца для аснашчэння будучых медустаноў.

Ізатопная прадукцыя «Расатама» экспартуецца ў 50 краін свету на працягу апошніх 60 гадоў. Дзесяць гадоў таму ў карпарацыі пачалі актыўна вырабляць і цяжкае медабсталяванне, у прыватнасці, лінейныя паскаралнікі, абсталяванне для брахітэрапіі. Метады лячэння брахітэрапіі (кантактнай прамянёвай тэрапіі пры лячэнні ракавых пухлін неінвазійнымі метадамі) актыўна прымяняюцца ў Беларусі, і вытворцам абсталявання ёсць адкуль атрымліваць зваротную сувязь, каб вырабляць прыстойнае абсталяванне, удакладніў гендырэктар:

— Менавіта на прыкладзе гаматэрапеўтычнага комплексу «Брахіум» мы сёння маем партнёрскія зносіны з беларускім прадпрыемствам, якое пастаўляе нам кампаненты, звязаныя з мікракрыніцамі. Цяпер мы разглядаем пытанне паглыблення кааперацыі ў частцы электроннай кампанентнай базы, выбудоўваем паўнапраўнае партнёрства ў гэтым сэнсе — не проста ствараем прыладу для продажу, а сумесна працуем над тэхнічным суверэнітэтам нашых краін.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Прыярытэты

Асаблівы саюзніцкі характар

Мінск і Масква разам супрацьстаяць любым спробам умяшання ва ўнутраныя справы дзвюх краін

Пра гэта гаворыцца ў заяве міністраў замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па агульных знешнепалітычных прыярытэтах Расіі і Беларусі, якую Сяргей Алейнік і Сяргей Лаўроў падпісалі па выніках праведзеных у Маскве перагавораў, паведаміла БелТА.

«Мінск і Масква сумесна працуюць над устараненнем знешніх пагроз нашай агульнай бяспецы, якія зыходзяць з боку недружалюбных дзяржаў, супрацьстаяць палітычнаму і незаконнаму санкцыйнаму ціску, а таксама любым спробам умяшання ва ўнутраныя справы нашых краін», — падкрэсліваецца ў дакументе.

Кіраўнікі МЗС Беларусі і Расіі пацвердзілі асаблівы саюзніцкі характар двухбаковых адносін і адзінства падыходаў па пытаннях міжнароднага і рэгіянальнага парадку дня. «Нашы краіны ідуць па шляху стварэння Саюзнай дзяржавы, у якой фарміруюцца агульныя прасторы эканомікі, энергетыкі, фінансаў, абароны і бяспекі, міграцыі, гуманітарнага супрацоўніцтва, роўных правоў і свабод грамадзян», — адзначаецца ў заяве.

Беларусь і Расія ўмацоўваюць узаемадзеянне на пляцоўцы ШАС і выступаюць за больш хуткае далучэнне Беларусі да арганізацыі. «Мінск і Масква надаюць асаблівае значэнне развіццю і ўмацаванню ўсёабдымнага супрацоўніцтва з краінамі Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і іх рэгіянальнымі аб'яднаннямі. Мы будзем каардынаваць палітычнае ўзаемадзеянне на згаданых напрамках, у тым ліку ў галіне падтрымання міру і бяспекі, а таксама знешнеэканамічнае супрацоўніцтва з дзяржавамі гэтых рэгіёнаў», — заявілі кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў. Краіны развіваюць усебаковыя ўзаемавыгадныя дружалюбныя сувязі з саюзнікамі і партнёрамі па еўразійскіх інтэграцыйных аб'яднаннях.

Беларусь і Расія не прымаюць насаджаныя Захадам дэструктыўныя ідэалогіі і абвяргаюць дзеянні па гераізацыі нацызму. Краіны працуюць над захаваннем сваёй гісторыка-культурнай і цывілізацыйнай спадчыны, процідзейнічаюць спробам фальсіфікацыі гісторыі.

Беларусь і Расія занепакоеныя спробамі краін Захаду падпарадкаваць ААН сваім інтарэсам. У дакументе канстатуецца, што Мінск і Масква актыўна ўзаемадзейнічаюць, каардынуюць свае дзеянні і падтрымліваюць адна адну на пляцоўках міжнародных арганізацый у мэтах забеспячэння інтарэсаў нашых краін. «Мы выступаем за ўмацаванне цэнтральнай каардынацыйнай ролі ААН і яе галоўных органаў, уключаючы Савет Бяспекі, у сусветных справах, пацвярджаем прыхільнасць нормам міжнароднага права, мэтам і прынцыпам Статута ААН, уключаючы суверэнную роўнасць дзяржаў і неўмяшанне ў іх унутраныя справы», — падкрэсліваецца ў заяве.

Міністр замежных спраў Беларусі падчас афіцыйнага візіту ў Расію сустрэўся са старшынёй Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Вячаславам Валодзіным, а таксама правёў перагаворы са старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай Матвіенкай.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Большасць брытанцаў не ўхваляе дзейнасць прэм'ера Сунака

Амаль 60 працэнтаў брытанцаў адмоўна ставіцца да дзейнасці прэм'ер-міністра Злучанага Каралеўства Рышы Сунака. Пра гэта сведчаць вынікі сацыялагічнага апытання, якое было праведзена кампаніяй YouGov, паведаміла ТАСС. Колькасць брытанцаў, якія станоўча ўспрымаюць Сунака, — 31 працэнт. Такім чынам, рэйтынг прэм'ера склаў адмоўнае значэнне 28 працэнтаў. Найбольш адмоўна брытанцы ўспрымаюць міністра фінансаў Джэрэмі Ханта — 61 працэнт рэспандэнтаў (станоўча — 18 працэнтаў), а кіраўніка МУС Суэлу Браверман — 52 працэнты (станоўча — 14 працэнтаў). На фоне гэтага колькасць апытаных, якія адмоўна ўспрымаюць кіруючую Кансерватыўную партыю, склала 66 працэнтаў, а станоўча думаюць пра яе толькі 22 працэнты рэспандэнтаў. Для параўнання, у апазіцыйнай Лейбарысцкай партыі абодва паказчыкі аказаліся прыкладна роўныя: 48 працэнтаў адмоўна ставяцца да яе, 44 працэнты — станоўча.

Bloomberg: інвестары аддалі перавагу біткоіну ў выпадку магчымага дэфолту ў ЗША

Замежныя інвестары выберуць біткоін, а не долар у выпадку магчымага дэфолту ў ЗША па сваім дзярждоўгу. Аб гэтым паведаміла агенцтва Bloomberg, спасылаючыся на даныя ўласнага апытання Bloomberg Markets Live Pulse. Больш за палову рэспандэнтаў лічыць, што няздольнасць амерыканскага ўрада расплаціцца па даўгах нанясе значную шкоду долару як глабальнай сусветнай валюце. Bloomberg заўважыла, што самым папулярным засцерагальным актывам стала золата, бо яго выбрала амаль палова апытаных рэспандэнтаў. На другім месцы па папулярнасці ў выпадку дэфолту аказаліся казначэйскія паперы ЗША, якія выбрала каля 15 працэнтаў апытаных. Замыкае тройку лідараў біткоін. Як вядома, днямі міністр фінансаў ЗША Джанет Елен заявіла ў пісьме лідарам Кангрэса, што дэфолт у краіне папярэдне можа быць аб'яўлены 1 чэрвеня. Адзначаецца, што яна таксама заклікала неадкладна павысіць мяжу дзярждоўгу.

САА3 заклікала праяўляць асцярожнасць пры выкарыстанні чат-ботаў са штучным інтэлектам

Сусветная арганізацыя аховы здароўя (САА3) заклікае чалавецтва праяўляць асцярожнасць пры выкарыстанні штучнага інтэлекту, такога як ChatGPT, для абароны самастойнасці людзей і аховы здароўя насельніцтва. Гэта адзначаецца ў апублікаванай заяве на сайце арганізацыі, паведаміла РІА «Навіны». «САА3 заклікае праяўляць асцярожнасць пры выкарыстанні інструментаў стварэння вялікіх моўных мадэляў (LLMS), створаных штучным інтэлектам, для абароны і садзейнічання дабрабыту, бяспецы і аўтаноміі людзей, а таксама захавання грамадскага здароўя», — сказана ў дакументе. Арганізацыя ўдакладняе: LLMS складаюцца з некаторых платформаў, што найбольш хутка пашыраюцца, такіх як ChatGPT, Bard, BERT і многіх іншых, якія імітуюць разуменне, апрацоўку і прайгравание чалавечых зносін.

ВІЗІТНАЯ КАРТКА АЙЧЫННАГА ВАЕНПРАМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Сёння, калі разбурана архітэктура міжнароднай бяспекі, калі згасае монапалярны свет, развязаны гібрыдныя інфармацыйныя войны рознага маштабу ў шматлікіх рэгіёнах свету, народжаны новыя выклікі і пагрозы — як унутранага, так і знешняга характару — у сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, — падкрэсліў Аляксандр Вальфовіч. — Зыходзячы з гэтага, абаронна-прамысловы комплекс краіны сёння стаў адным з найбольш прыярытэтных, высокатэхнічных і запатрабаваных сектараў эканомікі. Ва ўмовах беспрэцэдэнтных эканамічных, палітычных санкцый, ва ўмовах абвастрэння рызык пастаўкі абсталявання і камплектуючых прадукцыя ваеннага прызначэння прадпрыемстваў абароннага сектара краіны сёння канкурэнтаздольная і запатрабаваная на міжнародным рынку ўзбраення. Беларусь праводзіць палітыку адкрытасці, добрасуседства, узаемнай павагі і даверу».

Аб гэтым сведчаць і экспазіцыйныя пляцоўкі, дзе сканцэнтраваны найлепшыя дасягненні ваеннай навукі нашай краіны. Выстаўка MILEX ужо даўно стала не толькі дэманстрацыйным форумам, а і месцам узаемаадносін прадстаўнікоў абароннага сектара эканомікі.

На працягу чатырох дзён (да 20 мая ўключна) прафесіяналы азнаёмяцца з экспанатамі выстаўкі, а таксама абмяркуюць найважнейшыя пытанні нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці, рэалізацыі інавацыйнай і знешнеэканамічнай палітыкі дзяржавы.

Дзеля нацыянальных інтарэсаў

Як адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця выстаўкі **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**, за гады свайго існавання MILEX зарэкамендавала сябе не толькі як значная падзея для арганізацый абароннага сектара эканомікі, але і як эфектыўны форум для развіцця ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. «Міжнародная выстаўка па праву лічыцца аўтарытэтнай і познавальнай пляцоўкай для зносін экспертаў у галіне ўзбраенняў, дэманстрацыі найноўшых распрацовак у сферы вытворчасці прадукцыі ваеннага прызначэння і заключэння ўзаемавыгадных кантрактаў, — удакладніў кіраўнік абароннага ведамства. — Той факт, што сёння, нягледзячы на складаную ваенна-палітычную абстаноўку, сярод гасцей нашага мерапрыемства ёсць прадстаўнікі практычна ўсіх рэгіёнаў свету, красамоўна сведчыць аб тым, што ў нашай краіны ёсць шмат саюзнікаў, партнёраў і аднадумцаў на розных кантынентах. Яны таксама, як і наша краіна, працягваюць абараняць нацыянальныя інтарэсы сваіх дзяржаў, адстойваючы свой суверэнітэт і права самастойна выбіраць шлях свайго развіцця і вектары супрацоўніцтва, абапіраючыся на свае традыцыі, самабытнасць і менталітэт, а галоўнае — на інтарэсы сваіх народаў».

Віктар Хрэнін праінфармаваў, што на маштабным узброевым аглядзе, які праходзіць на беларускай зямлі, экспертнай супольнасці і грамадскасці прадстаўлены не толькі шырокі спектр прынцыпова новых, самых перадавых высокатэхналагічных узораў узбраення, але і даўгавечных, надзейных узбраенняў.

Некаторыя з іх распрацаваны ў канцы і нават у сярэдзіне XX стагоддзя, але, па яго словах, яшчэ не вычарпалі закладзены ў іх патэнцыял і рэсурс, якія пасля глыбокай мадэрнізацыі і адаптацыі да сучасных умоў вядзення ўзброенай барацьбы значна павысілі сваю баявую эфектыўнасць, эксплуатацыйныя характарыстыкі і эргаміку.

Міністр абароны падкрэсліў, што па сваіх характарыстыках многія вырабы беларускага ваенпрама не толькі не ўступаюць вядомым сусветным аналагам, але і па шэрагу напрамкаў пераўзыходзяць іх. Большасць з прадстаўленых на выстаўцы ўзораў ужо стаіць на ўзбраенні беларускай арміі, іншыя праходзяць выпрабаванні.

Удзельнікаў і гасцей выстаўкі падчас цырымоніі адкрыцця прывітаў і **генеральны сакратар АДКБ Імангалі ТАСМАГАМБЕТАЎ**. Ён заўважыў, што выстаўка MILEX сёння заслужана з'яўляецца візітнай карткай абароннага сектара эканомікі Беларусі. «Прадстаўленыя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі пераканаўча дэманструюць навукова-тэхнічны і прамысловы патэнцыял Беларусі, якая па праву ўваходзіць у лік сусветных вытворцаў узбраення, — заявіў генеральны сакратар АДКБ. — З задавальненнем адзначаю ўдзел у выстаўцы прадстаўнікоў абаронна-прамысловага комплексу дзяржаў — членаў АДКБ, дэлегацый іншых краін. Мяркую, што ў рамках гэтага дзелавой праграмы ўсе атрымаюць магчымасць для абмеркавання надзённых пытанняў супрацоўніцтва абаронных прадпрыемстваў».

На працягу ўсяго перыяду, калі працуе выстаўка, запланаваны двухбаковыя сустрэчы кіраўніцтва Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта і Міністэрства абароны Беларусі з кіраўнікамі замежных дэлегацый, адбудуцца шматлікія прэзентацыі ўдзельнікаў MILEX-2023. Адной з ключавых падзей выстаўкі стане 10-я Міжнародная навуковая канферэнцыя па ваенна-тэхнічных праблемах, праблемах абароны і бяспекі, выкарыстанне тэхналогій двайнога прызначэння.

Запланавана пасяджэнне Дзелавога савета пры Міждзяржаўнай камісіі па ваенна-эканамічным супрацоўніцтве АДКБ і Каардынацыйнага савета ўпаўнаважаных органаў дзяржаў — членаў АДКБ па пытаннях рэкламна-выставачнай дзейнасці.

На падмурку гісторыі і традыцый

Як пераканаўны **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ**, прафесійныя сустрэчы, дыскусіі, вынікі дыялогу, які адбудзецца ў найбліжэйшыя дні, пацвердзяць у тым ліку і практыку паспяховага ўзаемадзеяння беларускіх прамыслоўцаў, вучоных і даследчыкаў з калегамі і партнёрамі з Расійскай Федэрацыі. «Выстаўка MILEX пацвярджае важкі і значны прамысловы патэнцыял Беларусі, — акцэнтаваў увагу ён. — Чатыры краіны — Беларусь, Расія, Кітай і Іран — прадставілі свае высокія дасягненні абаронна-прамысловага комплексу на гэтых маштабных выставачных плошчах. Але знакава і тое, што дэлегацыі з больш як 30 краін прыехалі ў сталіцу Беларусі для таго, каб ацаніць магчымасці прамысловага патэнцыялу краіны. Тыя крокі, якія, магчыма, зробяць, будуць працаваць на ўмацаванне абароннага патэнцыялу гасцей і, самае галоўнае, на забеспячэнне рэгіянальнай і глабальнай бяспекі».

Дзмітрый Мезенцаў адзначыў, што частка праграм Саюзнай дзяржавы, якія фінансуюцца з саюзнага бюджэту, знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці: яны прысвечаны павышэнню абароннага патэнцыялу дзяржаў, аб'яднаных саюзным дагаворам. «Мы цудоўна разумеем, што гэтыя крокі з'яўляюцца адказам на тыя выклікі і пагрозы, якія склаліся ва Усходнееўрапейскім рэгіёне ў апошні час, — канкрэтызаваў дзяржаўны сакратар. — Гэта адказ на ціск і беспрэцэдэнтнае па маштабе і бестактоўнасці прасоўванне мадэлі аднапалярнага свету, якое мы бачым у апошні час у большасці краін калектыўнага Захаду».

Выстаўка MILEX ужо даўно стала не толькі дэманстрацыйным форумам, а і месцам узаемаадносін прадстаўнікоў абароннага сектара эканомікі.

Як падкрэсліў **старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Дзмітрый ПАНТУС**, гэтая важная выстаўка праходзіць у няпросты для ваенна-прамысловага комплексу краіны час. «Нестабільнасць палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай абстаноўкі ў свеце яшчэ больш настойліва прымушае нас ісці па шляху, раней абраным беларускім народам, па маршруце стварэння моцнай і квітнеючай Беларусі, — падкрэсліў ён. — Сілу і ўпэўненасць нам на гэтым нялёгкім шляху дае наша гісторыя. Ні адзін з маштабных узброеных канфліктаў двух апошніх стагоддзяў не абмінуў беларускую зямлю. Таму ваенна-прамысловы комплекс Рэспублікі Беларусь, як і ўвесь народ, накіраваны на мір і стваральную працу. Усе мы разумеем, што гэтыя два асноўныя фактары спрыяльнага развіцця магчымыя толькі ў моцнай дзяржаве, якая валодае дастатковай эканамічнай і ваеннай магутнасцю. Поспехі, дасягнутыя спецыялістамі айчыннага ВПК за гады незалежнасці нашай дзяржавы, стаяць на трывалым падмурку гісторыі і традыцый збройвай вытворчасці».

Дзмітрый Пантус нагадаў, што ў канцы 2023-га споўніцца 20 гадоў з дня заснавання Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта. «За гэты перыяд мы планамерна выбудавалі сістэму ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва з многімі нашымі замежнымі партнёрамі, — заўважыў ён. — І выстаўка MILEX, якую мы адкрываем, з'яўляецца своеасаблівым індыкатарам нашай гатоўнасці і ў далейшым пашыраць узаемадзеянне з усімі зацікаўленымі дзяржавамі на аснове ўзаемнай павагі і інтарэсаў адзін аднаго».

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 19 июня 2023 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объектов недвижимости: зданий и сооружений производственной базы, расположенных по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Революционная, 2А, принадлежащих открытому акционерному обществу «Дорожно-строительный трест № 2, г. Гомель» на праве собственности

Лот № 1

Административное здание конторы, инв. № 343/С-95854 (г. Хойники, ул. Революционная, 2А). Назначение: здание административно-хозяйственное. Двухэтажное кирпичное здание, 1974 года постройки (реконструкция – 2022 год). Общая площадь 454,7 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка.

Материальный склад, инв. № 343/С-78607 (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/4). Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное здание, 1974 года постройки. Общая площадь 338,8 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка.

Реммастерские, инв. № 343/С-78606 (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/1). Назначение: здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции). Одноэтажное кирпичное здание, 1974 года постройки. Общая площадь 1 082,7 кв. м. Составные части и принадлежности: шесть пристроек.

Сети водопровода (внеплощадочный водопровод, внутриплощадочные водопроводные сети на промбазе), инв. № 343/С-95922 (г. Хойники, ул. Революционная, 2А, сети водопровода). Назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения, 1974 года постройки. Протяженность 239,6 кв. м. Составные части и принадлежности: внеплощадочный водопровод (трубопровод пэ63 – 2 шт., трубопроводная арматура – 2 шт., колодец ВК-1), внутриплощадочные водопроводные сети на промбазе (трубопровод пэ63).

Трансформаторная подстанция, инв. № 343/С-95923 (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/5). Назначение: сооружение специализированное энергетики. Одноэтажное кирпичное сооружение, 1975 года постройки. Общая площадь 38,3 кв. м.

Ангар для технического обслуживания дорожных машин, инв. № 343/С-78608 (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/3). Назначение: здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции). Одноэтажное металлическое здание, 1994 года постройки. Общая площадь 363,0 кв. м.

Благоустройство-ограждение, инв. № 343/С-95924 (г. Хойники, ул. Революционная, 2А, ограждение). Назначение: сооружение неустановленного назначения, 1991 года постройки. Составные части и принадлежности: два ограждения

Начальная цена лота: 1 029 571,20 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
Задаток: 10 296,00 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве постоянного пользования площадью 4,4182 га с кадастровым номером 325450100001017061. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на территориях, подвергшихся радиоактивному загрязнению, площадью 4,4182 га, и расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,3427 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7.

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 16.06.2023 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **19.06.2023 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) языки. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000010135000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 401166490, назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 18.05.2023 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47; сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by.
Продавец: ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель», г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, тел.: +375 232 33-84-69; +375 44 502-24-31; +375 29 937-62-18

Сямейная газета

Выпуск № 9 (212)

КАХАННЕ — ГЭТА ДЗЕЯСЛОЎ

Вечар пятніцы. Я стаю на прыпынку і чакаю маршрутку. Побач з нагі на нагу перамінаецца сівавалосы падцягнуты мужчына ў джынсах і светлай кашулі. І вось да прыпынку пад'язджае аўтобус, дзверы адчыняюцца, і адтуль выходзіць стройная жанчына на невысокіх абцасіках. Мужчына падае ёй руку, і яны няспешна рушаць у бок метро. На выгляд ім 60 з хвосцікам. Я з замілаваннем гляджу той пары ўслед, аж пакуль яны не знікаюць.

Кожны раз, калі бачу, як людзі ў сталым узросце ідуць узяўшыся за рукі (а гэта, на жаль, здараецца вельмі рэдка), згадваю гісторыю, якую пачула ад гераіні аднаго са сваіх артыкулаў. Пра тое, як яна каля паліклінікі ўбачыла парачку ў сталым узросце. «Бабуля ішла павольна, па адчуваннях ёй балела спіна. Раптам у яе развязаўся шнурок. Дзядуля, як сапраўдны рыцар, устаў на калена, хоць нагнуцца яму, відаць, было цяжкавата, і завязаў ёй шнурок з фразай: «Люба, выдатны момант зрабіць табе прапанову рукі і сэрца яшчэ раз». Яны так звонка і цёпла смяяліся!.. Тады я чарговы раз пераканалася, што свет поўны любові».

Але ўсё ж часцей бачу, як сужэнцы стаяла веку папракаюць адно аднаго (і гэта не так зрабіў, і тое не так сказаў), кідаюцца калючымі словамі... Нядаўна назірала, як Рыгоравіч (а яму ўжо за 80!) пайшоў бяліць дрэвы. Здаецца, жонцы варта было б пахваліць яго, каб заахвоціць яшчэ больш, але ж не... Іванаўна, як заўсёды, незадаволеная: «Ты хоць перааправуўся бы, усё трэба падказваць, як дзіцяці малому».

Вы глядзелі драму «Каханне» Міхаэля Ханэке? У гэтым фільме ў цэнтры ўвагі пара, якая пражыла ва ўзаемным каханні і пяшчоце, пастаянна клапоцячыся адно аб адным, да самай старасці. У чым сакрэт? Як захаваць цёплыя, кранальныя, рамантычныя адносіны да сівых валасоў?

Самае галоўнае, на маю думку, пачуццё гумару. Часам, ідучы за сваёй ганарлівасцю і комплексамі, мы ўмудраемся раздзьмуць з мухі слана замест таго, каб перавесці праблему ў жарт. Дарэчы, калі ўжо зайшла гаворка пра гумар... Псіхолаг Карына Рыхтарэ нядаўна запісала ролік, дзе дала замужнім жанчынам тры шкодныя парады. Па-першае, маўчым: пакажыце, што вы пакрыўдзіліся, але ні ў якім разе не кажыце прычыну. Нехай сам здагадаецца! Па-другое, ніякіх спатканняў і ніякай рамантыкі. Вы больш не муж і жонка. Вы цяпер — бацькі. Па-трэцяе, у выпадку канфліктаў заўсёды прыцягваем для разборак іншую асобу. Гэта можа быць дзіця, сяброўка, самы лепшы варыянт — ваша мама... Але потым дадала, што, канешне ж, усё трэба рабіць з дакладнасцю наадварот. «Не гуляйце з партнёрам у маўчанку, ён не ўмее чытаць вашы думкі. Правільна выбудаваная камунікацыя — залог здаровых адносінаў... Не дазваляйце сабе патануць у руціне. Уносьце змены ў паўсядзённыя справы. Хадзіце на спатканне. Бо ў першую чаргу вы пара і толькі потым бацькі. Ваша жыццё не павінна круціцца выключна вакол дзяцей і іх інтарэсаў. Ну і, нарэшце, вырашайце ўсе канфлікты без прыцягнення іншых. Абмеркаванне з трэцім бокам не дапаможа вырашыць сітуацыю, а можа нават яе пагоршыць».

Яшчэ мне вельмі падабаецца тэхніка ўдзячнасці. Хваліце і дзякуйце мужу за тое, што прынёс цяжкія сумкі, за сына і дачку, за абдымкі, за тое, што сустрэў з працы. Вельмі хутка ён пачне падтрымліваць вашу гульню і хваліць вас.

На адным з семінараў да псіхолага Стывена Кові звярнуўся мужчына: «Я вельмі занепакоены. Мы з жонкай ужо не адчуваем адзін да аднаго ранейшых пачуццяў. Напэўна, я яе проста больш не кахаю, ды і яна мяне таксама. А ў нас трое дзяцей, нас хвалюе іх лёс. Што вы мне параіце?» — «Кахайце яе!» — «Не, вы не зразумелі! Ніякага кахання ўжо больш няма!» — «Калі пачуццё сышло, то ў вас ёсць цудоўная прычына, каб кахаць яе!» — «Але як кахаць, калі не кахаеш?» — «Кахаць» — гэта дзеяслоў, які азначае дзеянне. Каханне-пачуццё — гэта плод кахання-дзеяння. Дык кахайце ж яе! Служыце ёй. Ахвяруйце сабой. Слухайце яе. Суперажывайце ёй. Цаніце яе. Падтрымлівайце. Ну як, вы гатовы кахаць яе?»

Каб пачуцці жылі і не патухалі, трэба ўкладваць у адносіны свой час, матэрыяльныя і эмацыянальныя рэсурсы. А калі матылькі ў жываце скончыліся, значыць мы мала робім для гэтага чалавека. Бо кахаць — гэта не атрымліваць, а аддаваць. Клапаціцца, прыкмячаць станоўчыя якасці, дзякаваць, аберагаць, проста трымаць адно аднаго за руку. Пагадзіцеся, гэта ж так лёгка — трымаць адно аднаго за руку.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

Андрэй УСАНАЎ:

«Сям'я без дзяцей нібыта незавершаная»

Упершыню на вялікую сцэну Андрэй Усанаў выйшаў у форме малодшага сяржанта, калі ўдзельнічаў у конкурсах вайсковай патрыятычнай песні. Поспех быў ашаламляльны: Гран-пры і запрашэнне... у «Песняры»! Не сакрэт, што ўсе пакаленні музыкантаў знакамітага калектыву былі зайздроснымі жаніхамі. Вось і раман Андрэя з яго будучай жонкай Ксеніяй пачынаўся, калі ён быў «песняром», але ажаніўся, калі ўжо стварыў свой гурт «Спадчына». Цяпер у сям'і падрастаюць дзве любімыя дачушкі.

— Як вы пазнаёміліся?

Андрэй (А.): — Упершыню ўбачыў Ксенію, калі здаваў уступныя іспыты ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, яна мне спадабалася з першага погляду. А пазнаёміліся толькі пасля заканчэння першага курса, калі дзве групы арганізавалі вечарынку з гэтай нагоды.

Ксенія (К.): — Я не бачыла Андрэя на занятках, да мяне толькі даходзілі чуткі аб тым, што ў другой групе вучыцца вельмі прыгожы хлопчык, які спявае ў «Песнярах». Некаторыя дзяўчынкі з нашай групы нават хадзілі глядзець на яго *(смяецца)*. Толькі праз год мы з ім пазнаёміліся, а ініцыятарам была мая сяброўка. Яна патэлефанавала і сказала, каб я тэрмінова ехала на вечарыну, бо туды прыйшоў Андрэй. Сяброўка была ўпэўнена, што нам трэба пазнаёміцца. А я якраз не вельмі хацела ехаць, але яна мяне ўгаварыла. Цяпер магу сказаць: гэта было каханне з першага погляду. З майго боку *(смяецца)*.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Далікатная тэма

МАЛЫЯ ПАД ПАГРОЗАЙ

Што хаваюць прапановы «пазнаёміцца бліжэй»?

За тры апошнія гады колькасць выяўленых міліцыяй фактаў педафіліі вырасла ў два разы. У пераважнай большасці выпадкаў педафіл — гэта мужчына сярэдняга ўзросту, несацыялізаваны, які вядзе закрыты лад жыцця. Ахвярамі звычайна становяцца дзеці ад 8 да 13 гадоў, якіх знаходзяць у інтэрнэце. Часам гэтыя злачынствы здзяйсняюць бацькі, іншыя сваякі і людзі, блізкія да сям'і, а таксама трэнеры ці педагогі.

Не толькі ў сталіцы

— Пагроза сексуальнага гвалту ў адносінах да дзяцей не проста існуе, а вельмі актуальная як для сталіцы, так і для краіны ў цэлым, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама Дзмітрый УСАРАЎ.** — Педафілія непарыўна звязана з абаротам дзіцячай парнаграфіі, часта яны спадарожнічаюць адна адной ці ўзаемна абумоўленыя.

Сёлета толькі сталічнай міліцыяй выяўлена 170 злачынстваў у сферы педафіліі і абароту дзіцячай парнаграфіі, з іх больш за палову — цяжкія ці асабліва цяжкія. Прыцягнуты да крымінальнай адказнасці ці з'яўляюцца фігурантамі крымінальных спраў, якія расследуюцца, 83 асобы. Устаноўлена 105 дзяцей, якія пацярпелі ад гэтых дзеянняў, з іх больш за палову — малалетнія (да 14 гадоў). Сярод фактаў педафіліі, якія выяўляюцца, пераважаюць гвалтоўныя злачынствы, у прыватнасці гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару, і распусныя дзеянні, калі дзяцей спакушаюць не фізічна, а інтэлектуальна. Астатнія злачынствы складаюць палавыя зносіны і іншыя дзеянні сексуальнага характару з асобамі, якія заведама не дасягнулі ўзросту палавой згоды (16 гадоў).

Сярод фактаў абароту дзіцячай парнаграфіі больш за палову складае не толькі яе распаўсюджанне, але і выкарыстанне дзяцей у гэтых мэтах, калі злачынца здымае на камеру дзіця і вырабляе парнаграфічны кантэнт.

З 2020 да 2023 года колькасць выяўленых міліцыяй фактаў педафіліі вырасла ў два разы, колькасць падазраваных — на 30 %, пацярпелых — на 9 %. У абароце дзіцячай парнаграфіі негатыўная дынаміка яшчэ большая. Колькасць такіх фактаў з 2020 года павялічылася ў Мінску больш чым у пяць разоў, падазраваных стала ўдвая больш, і больш чым у 3,5 раза вырасла колькасць дзяцей, якія пацярпелі ад абароту дзіцячай парнаграфіі.

Мужчыны сярэдняга ўзросту...

За сексуальныя замахі на дзяцей затрымліваюць самых розных людзей з розных сацыяльных груп. У пераважнай большасці выпадкаў гэта мужчына сярэдняга ўзросту, звычайна несацыялізаваны, які вядзе закрыты лад жыцця.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

МАЛЫЯ ПАД ПАГРОЗАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Што немалаважна, затрыманыя з'яўляюцца актыўнымі спажыўцамі дзіцячай парнаграфіі — у 90 % выпадкаў. Менавіта пасля прагляду дзіцячай парнаграфіі з'яўляецца жаданне здзейсніць фізічныя сексуальныя дзеянні ў адносінах да дзіцяці, чым падкрэсліваецца грамадская небяспека гэтага кантэнту. Адметна, што ў некаторых выпадках педафілы ў дзяцінстве і самі падвяргаліся сексуальнаму гвалту. Напрыклад, у 2022 годзе затрымана два такія чалавекі. Яны з'яўляліся выхаванцамі дзіцячых інтэрнатных устаноў і ў падлеткавым узросце былі пацярпелымі па крымінальных справах па педафіліі. Пасля самі сталі здзяйсняць падобныя злачынствы, — расказвае Дзмітрый Усараў.

> Ахвярамі звычайна становяцца дзеці ад 8 да 13 гадоў, калі яны ўжо атрымалі пэўную самастойнасць у перасоўванні, кантактаванні, у тым ліку ў інтэрнэце, а з іншага боку, яшчэ не здольныя да канца распазнаць злачынства і супрацьстаяць яму. І менавіта такі ўзрост карыстаецца «попытам» у педафілаў.

У адзінкавых выпадках, кажа Дзмітрый Усараў, выяўляюцца дзеці больш ранняга ўзросту, аж да груднога. Існуюць выпадкі, калі ахвярамі сексуальных злачынстваў становяцца падлеткі ад 14 да 16 гадоў. І гэтаму часта спрыяюць элементы адпаведнага ладу жыцця: або заўчасныя адносіны з паўналетнімі асобамі, або актыўнае наведванне так званых флэтаў, ужыванне алкаголю.

Знаёмяцца на сайтах

Пакаранне за сексуальныя злачынствы ў адносінах да дзяцей у залежнасці ад цяжару вар'іруецца ад 3 да 15 гадоў пазбаўлення волі. Калі мужчына ўчыніў злачынства з прычыны псіхічнага расстройства, якое не дазваляе гэта ўсведамляць, то ў адносінах да яго могуць прымяніць меры прымусовай бяспекі і лячэння. Замест турэмнага пакарання ён змяшчаецца ў псіхіятрычны стацыянар.

— Варта разумець, што выпадкі, калі педафіл — псіхічна хворы чалавек, на практыцы адзінкавыя. У пераважнай большасці такія злачынцы выдатна ўсведамляюць, што яны робяць і што іх дзеянні забароненыя законам. І ўсё роўна іх здзяйсняюць, — кажа праваахоўнік.

Галоўная праблема, паводле яго слоў, — выяўленне такіх злачынстваў і іх высокая латэнтнасць, калі ахвяра ці яе дарослы блізкі замоўчваюць факт сексуальнага гвалту. Часам прычынай з'яўляюцца недастаткова ўважлівыя адносіны з боку дарослых да паводзін, знешняга выгляду, стану і ладу жыцця дзіцяці. Другая праблема — перамяшчэнне злачынстваў, звязаных з сексуальным гвалтам, у віртуальную прастору, куды сёння пераходзіць амаль уся злачыннасць.

> Педафілы карыстаюцца тым, што ў віртуальнай прасторы кантроль за дзецьмі аслаблены. Ахвяр шукаюць на розных рэсурсах для знаёмстваў, на сайтах, прывязаных да дзіцячых анлайн-гульняў, чат-рулетках, дзе і наладжваюць з дзецьмі кантакт. Педафіл уваходзіць з непаўналетнім у даверлівыя адносіны, як правіла, выдае сябе за равесніка ці непаўналетняга або асобу, якая можа выклікаць цікавасць.

— Пачынаецца кантактаванне, дзіця паведамляе педафілу пра сябе нейкія сакрэтныя, па яго меркаванні, звесткі, часам адпраўляе фотаздымкі, у тым ліку інтымныя. А далей педафіл пачынае патрабаваць больш адкрытыя фота, у тым ліку парнаграфічныя, прапаноўвае сустрэцца ўжывую для сексуальных адносін. І калі дзіця адмаўляецца, пачынае яго шантажыраваць, што распаўсюдзіць ужо атрыманае ад яго ці проста раскажа пра яго недапушчальныя паводзіны. І дзіця на гэта вядзецца, бо толькі адзінкі расказваюць бацькам, — кажа Дзмітрый Усараў.

І тут вельмі важная роля дарослых. Не кожны з іх, нават даведаўшыся пра такую перапіску, звяртаецца ў міліцыю.

— Летась выявілі педафіла, які спакусіў больш за дзясятак дзяўчынак, а пазалетась — яшчэ аднаго, ахвярамі якога было больш за трыццаць дзяўчынак ва ўзросце да 11 гадоў. У некаторых выпадках бацькі ведалі, што іх дзецям піша падазроная асоба, але замест таго, каб зафіксаваць перапіску, зрабіць скрыншоты, яны яе выдалялі, казалі дзіцяці, каб больш так не рабіла, і ў міліцыю не звярталіся. У выніку педафіл пэўны час заставаўся па-за полем зроку праваахоўных органаў, хоць мог быць ідэнтыфікаваны і спынены значна раней, — кажа суразмоўнік.

Сёння ў інтэрнэце здзяйсняецца каля 10 % фактаў сексуальнага гвалту ў адносінах да дзяцей. І ўдзельная вага віртуальнай прасторы толькі ўзрастае.

Гвалт у сям'і

Латэнтнасці злачынстваў садзейнічае і тое, што здзяйсняюцца яны часам бацькамі і іншымі сваякамі ці людзьмі, блізкімі да сям'і. Гэта самыя небяспечныя выпадкі, бо дзіця-ахвяра залежыць ад злачынцы і псіхалагічна яму цяжка паведаміць у міліцыю. Пры гэтым другі з бацькоў часта свядома ўсё замоўчвае. У выніку сексуальны гвалт у сям'і доўжыцца шмат гадоў.

— Летась выявілася, што дваіх дзяўчынак-блізнят, вучаніц адной са сталічных школ, сужыцель маці, якая злоўжывала алкаголем, спакушаў больш за два гады, і пра злачынства стала вядома толькі тады, калі дзяўчынка з гэтай сям'і пераехала да біялагічнага бацькі, дзе разняволілася і расказала пра тое, што адбывалася. Пазалетась стаў вядомы выпадак, калі гвалт працягваўся больш за 10 гадоў, і паведаміў пра гэта пацярпелы ў сваім дзённіку толькі тады, калі паступіў у сталічны каледж, дзе на яго паводзіны звярнулі ўвагу псіхолагі. Да гэтага сексуальны гвалт з боку бацькі заставаўся ў цені, — прывёў прыклады Дзмітрый Усараў.

Зусім нядаўні выпадак — у Савецкім раёне сталіцы быў затрыманы 33-гадовы грузчык. Ён здзяйсняў гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару ў адносінах да ўласнай пляменніцы, знаходзячыся ў яе дома, у тым ліку калі ў суседнім пакоі былі яе бацькі. Дзяўчынка рашылася расказаць пра тое, што адбываецца, сваёй маці, толькі праз два гады, прычым у запісцы. Некалькі лісткоў паперы яна моўчкі перадала маці. Тая прачытала, правяла з дзяўчынкай даверлівую размову і паведаміла ў міліцыю.

> Хоць і нячаста, але здараюцца выпадкі сексуальных злачынстваў, здзейсненых трэнерамі, педагогамі, а таксама абсалютна незнаёмымі людзьмі на вуліцах. За два мінулыя гады было некалькі сітуацый, калі з дваровых пляцовак дзяцей звозілі «пагуляць» ці паглядзець кіно, і яны падвяргаліся дзеянням сексуальнага характару з боку абсалютна незнаёмых людзей. Адметна, што малым было гадоў пяць-шэсць.

Спыняе толькі міліцыя

Як адзначае Дзмітрый Усараў, для супрацьдзеяння сексуальнай эксплуатацыі дзяцей намаганняў толькі міліцыі недастаткова. Тут патрэбны меры з боку ўстаноў адукацыі, работнікі якіх пастаянна кантактуюць з дзецьмі, арганізацый аховы здароўя і, безумоўна, самі бацькоў. Менавіта апошнія павінны праводзіць даверлівыя размовы, тлумачыць, што такія небяспекі існуюць і на іх трэба правільна рэагаваць, у тым ліку пра любую падазроную сітуацыю паведамляць бацькам. А тыя, у сваю чаргу, павінны быць гатовы праінфармаваць міліцыю.

Дарэчы, асобы, схільныя да здзяйснення такіх злачынстваў, знаходзяцца пад пастаянным кантролем міліцыі. Увесь час праводзіцца і аператыўная работа, у тым ліку ў інтэрнэце. Сёння міліцыя мае інструменты, у тым ліку праграмна-тэхнічныя, каб адсочваць патэнцыяльных педафілаў у выглядзе спажыўцоў дзіцячай парнаграфіі, якія яе скачваюць і захоўваюць. Толькі ў Мінску колькасць такіх карыстальнікаў перавышае некалькі дзясяткаў.

— Не кожны з іх злачынца, але кожны з іх можа ім стаць. Сёння караецца выраб і распаўсюджанне дзіцячай парнаграфіі. Аднак міліцыя актыўна лабіруе пытанне аб увядзенні адказнасці за захаванне і спажыванне дзіцячай парнаграфіі. Гэта дапаможа папярэдзіць у будучым сексуальны гвалт у адносінах да дзяцей на ранняй стадыі, — паведаміў праваахоўнік.

Выпрацаваны алгарытм перадачы педагогамі і медыкамі інфармацыі аб прыкметах сексуальнага гвалту. Грамадзяне могуць паведаміць пра сексуальны гвалт не толькі па тэлефоне ці звярнуўшыся з заявай, але і ў спецыяльным чат-боце ГУУС Мінгарвыканкама, дзе іх інфармацыя будзе аператыўна прынята і апрацавана і па ёй правядуць усебаковую праверку.

Узаемадзеянне праваахоўнікаў з пацярпелымі дзецьмі адбываецца з удзелам падрыхтаваных псіхолагаў, у выпадку малалетніх дзяцей — у спецыяльна абсталяваным пакоі, дзе з малым кантактуе толькі псіхолаг. Інфармацыя пра тое, што дзіця стала ахвярай сексуальнага гвалту, цалкам канфідэнцыяльная.

— Трэба разумець, што, звярнуўшыся ў міліцыю, вы атрымаеце ўсю дапамогу. У краіне для гэтага працуе адпаведны нацыянальны механізм, сувыканаўцамі якога з'яўляюцца ўсе зацікаўленыя суб'екты прафілактыкі. Спыніць педафіла можна, толькі паведаміўшы пра яго міліцыі, іншыя спосабы не працуюць, — рэзюмаваў Дзмітрый Усараў.

Алена КРАВЕЦ.

Лічбы і факты

Разводаў стала менш

«Узровень разводаў у краіне за апошняе дзесяцігоддзе ў цэлым мае тэндэнцыю да скарачэння», — паведаміла начальнік управаўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.

У 2021 годзе зарэгістравана 34,4 тыс. разводаў, гэта на 11 працэнтаў менш, чым у 2011 годзе, і на 2 працэнты менш, чым у 2020 годзе. Паводле статыстыкі, маладыя шлюбы сталі распадацца радзей. За 2020-2021 гады пік распаду саюзаў зрушыўся са шлюбаў да 5 гадоў на больш працяглыя саюзы. У 2021 годзе часцей за ўсё распадаліся шлюбы працягласцю ад 5 да 10 гадоў, 18,3 працэнта шлюбаў захоўваліся ад 10 да 15 гадоў, 10 працэнтаў — ад 15 да 20 гадоў, і крыху больш за 14 працэнтаў — гэта шлюбы 20 гадоў і старэйшыя. З улікам такіх тэндэнцый вельмі важным сёння з'яўляецца ўмацаванне інстытута сям'і, захаванне яе духоўна-маральных каштоўнасцяў.

Акрамя таго, прадстаўнік Мінпрацы адзначыла, што ў краіне назіраецца скарачэнне колькасці зарэгістраваных шлюбаў. «Па выніках 2021 года зарэгістравана 59,6 тыс. шлюбаў. За апошнія 10 гадоў іх колькасць зменшылася на 31 працэнт. Гэта звязана перш за ўсё са скарачэннем колькасці насельніцтва ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў, якое за гэты перыяд зменшылася на 35 працэнтаў. «Пры гэтым, калі параўноўваць 2021 год з 2020-м, колькасць шлюбаў павялічылася на 18 працэнтаў. Гэта самы значны прырост за апошняе дзесяцігоддзе. Мы мяркуем, што на лічбу паўплывала рэалізацыя адкладзеных з-за пандэміі ў 2020 годзе вяселляў. За апошнія дзесяцігоддзі беларуская сям'я ўвогуле значна трансфармавалася, адбыліся змены ў функцыях бацькоў, а таксама сёння наша моладзь больш узважана падыходзіць да пытанняў заключэння шлюбу і нараджэння дзяцей — яны робяць гэта ў пазнейшыя тэрміны, паспяваючы спачатку атрымаць адукацыю, пачаць прафесійную дзейнасць і нават пабудаваць кар'еру. Сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб у 2021 годзе склаў 28,6 года сярод мужчын і 26,3 года сярод жанчын. Сярэдні ўзрост маці пры нараджэнні першага дзіцяці — амаль 27 гадоў, у той час як у 1990 годзе ён не дасягаў і 23 гадоў».

Акрамя таго радуе, што за апошнія 10 гадоў колькасць абортаў у краіне знізілася з 12 (у 2012 годзе) да 5,6 (2022) на тысячу жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту. Аб гэтым паведаміла **намеснік дырэктара па педыятрыі РНПЦ «Маці і дзіця» Алена УЛЕЗКА.** Паводле слоў прафесара, перадабортнае кансультаванне праходзяць усе жанчыны, якія вырашылі перапыніць цяжарнасць, і вынік дастаткова добры. У 2022 годзе захавана больш за пяць тысяч цяжарнасцяў.

У Беларусі штогод нараджаюцца дзеці з дапамогай сучасных тэхналогій, у прыватнасці ЭКА. Дзяржава фінансава падтрымлівае пары, якія пакутуюць на бясплоддзе. Ім прадстаўляюцца крэдыты на льготных умовах для аплаты ЭКА. Акрамя таго, гарантавана правядзенне адной бясплатнай спробы ЭКА ў трох дзяржаўных медустановах: РНПЦ «Маці і дзіця», мінскім гарадскім радзільным доме № 2 і Гомельскім абласным дыягнастычным медыка-генетычным цэнтры з кансультацыяй «Шлюб і сям'я». «У мінулым годзе праведзена 1887 поўных цыклаў лячэння бясплоддзя метадамі дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій на бюджэтнай аснове, наступіла 663 клінічныя цяжарнасці», — паведаміла Алена Улезка.

Расходы за два апошнія гады на правядзенне бясплатна адной спробы ЭКА па трох установах з рэспубліканскага бюджэту склалі 12 мільёнаў рублёў (2022 год — 6,5 мільёна рублёў, 2021 год — 5,5 мільёна рублёў).

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

«Сям'я без дзяцей нібыта незавершаная»

Ксенія, Андрэй і Эмілія.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— І як развіваўся ваш студэнцкі раман?

А.: — Падчас вучобы ўтвараліся невялікія групы студэнтаў па інтарэсах, мы былі актыўнымі і вясёлымі, часта бавілі час разам. Так паступова справа дайшла да першага пацалунка, а ініцыятарам была Ксюша! І вось у той момант я раптам адчуў, што Ксюша для мяне даўно родны і блізкі чалавек. У Ксюшы аптымістычны погляд на жыццё, выдатнае пачуццё гумару, нам заўсёды было лёгка мець зносіны, і... яна вельмі прыгожая!

— Колькі часу прайшло ад першага пацалунка да вяселля?

А.: — Чатыры гады. Вяселле мы згулялі ў 2014 годзе, а да гэтага тры гады жылі разам. У нас — не ведаю, на жаль ці на шчасце — не было ніякіх прыгожых сцэн накшталт таго, што я дару пярсцёнак і прашу выйсці за мяне замуж. Мы неяк гулялі па горадзе і выпадкова натрапілі на ЗАГС, вырашылі зайсці і афарміць адносіны. А вяселле згулялі пазней. Так пачаўся новы этап нашага жыцця.

— Паспелі самі зарабіць на вяселле або дапамагалі бацькі?

А.: — Асноўная фінансавая нагрузка легла на нашых бацькоў. Па беларускіх мерках у нас атрымалася сціплае вяселле — 40 гасцей. Але гэта былі сапраўды найбліжэйшыя сваякі і сябры. Свята выйшла вельмі атмасферным, утульным, сямейным, вясёлым. Шмат было традыцыйных беларускіх вясельных забаў, танцаў.

— Хто з артыстаў адказваў за культурную праграму на вяселлі?

А.: — Сярод гасцей было шмат музыкантаў і спевакоў, таму спявалі ўсе, хто мог і, безумоўна, калегі з «Песняроў».

— Тры гады вы жылі ў незарэгістраваным шлюбе. Кажуць, што мужчыны ў такім выпадку адчуваюць сябе халасцякамі, а жанчыны — замужам. А як вы ўспамінаеце той час?

К.: — Можа, я празмерная аптымістка, але чамусьці была ўпэўнена, што справа скончыцца вяселлем.

А.: — Мужам, магчыма, я і не адчуваў сябе, але тое, што мы пара, мы разам, гэта было. Больш за тое, я лічу, што пажыць нейкі час у незарэгістраваным шлюбе карысна. Як бы людзі адно аднаму ні падабаліся, якім бы моцным ні было прыцягненне, але побыт можа загубіць усё. І пакуль ты знаходзішся ў так званым выпрабавальным шлюбе, вельмі лёгка грукнуць дзвярыма і сысці. А вось калі ты не сыходзіш, шукаеш нейкі кампраміс, аб чымсьці дамаўляешся, ідзеш на саступкі, значыць гэты чалавек табе дарагі. І да моманту рэгістрацыі шлюбу ты глядзіш на яго ўлюбёнымі, але адкрытымі вачыма. Мы пасля вяселля ніякіх змен у адносінах не адчулі, таму што ўсе складанасці, прыціркі ўжо мінулі.

— У Андрэя шмат прыхільніц. Хтосьці захапляецца голасам, а шматлікія дзяўчаты дадаюць: «І такі прыгажун!» Ці не дакучаюць нястрыманыя фанаткі?

К.: — На шчасце, няма такіх фанатак, якія б дзесьці падпільноўвалі мужа... Успамінаю, калі мы пачалі сустракацца з Андрэем, мама маёй сяброўкі сказала ёй: «Ой, і не салодка ж давядзецца Ксюшы! У яго ж столькі прыхільніц!» Магу сказаць, што раней я была ў сабе занадта ўпэўненая і нават думкі не дапускала пра нейкую там рэўнасць, прыхільніц і іншае. Проста былі я і ён. З часам упэўненасць згасла (*смяецца*), і я пачала дапускаць такія думкі. Прызнаюся, што рэўнасць да прыхільніц, безумоўна, прысутнічае. З іншага боку, мне прыемна, што муж яшчэ камусьці падабаецца, да таго ж гэта працуе на папулярнасць, што немалаважна для артыста. Пакуль што ў нас не было нагод для сур'ёзных размоў на гэтую тэму, і я адчуваю, што давяраю Андрэю.

— Якая песня ў выкананні Андрэя ваша самая любімая?

К.: — Скажу дакладна, што мая самая нелюбімая песня — гэта «Раскажы» (*смяецца*). Да гэтага часу не разумею, чаму ўсе, як гаворыцца, «да дзірак» яе заслухалі, хоць ёй ужо столькі гадоў. Усе песні Андрэя праходзяць праз мяне. Маю на ўвазе, што перш чым песня выходзіць у людзі, яе слухаю я. Усе чарнавікі і парутройку варыянтаў вакалу Андрэя для адной і той жа песні. І мне, пакуль песня выходзіць, яна ўжо часам надакучвае (*смяецца*). Але гэта не значыць, што няма песень, якія я гатова слухаць хоць кожны дзень. Мае любімыя — гэта «Мілая жанчына» і «Няўжо ты больш не любіш мяне». Андрэй цяпер рыхтуе яшчэ адну прыгожую песню на беларускай мове, якая павінна ўжо вось-вось выйсці ў эфір. І яна таксама папоўніць шэрагі маіх самых любімых песень у яго выкананні. Слухаеш як мантру. Гэта будзе вельмі сучасная па форме песня аб вечных каштоўнасцях у шчымлівым выкананні Андрэя. Не дачакаюся, калі пачну слухаць яе ў машыне.

— Вы планавалі нараджэнне дзяцей?

А.: — Так, планавалі. Непакоіла, што многія знаёмыя сутыкнуліся з праблемай, калі проста не атрымліваецца завесці. Пры гэтым у іх няма ніякіх глабальных праблем са здароўем. Мы былі шчаслівыя, калі Бог падарыў нам дачку і ўсё атрымалася натуральным чынам. Жыццё змянілася кардынальна, магу дакладна сказаць, што для нас сям'я без дзяцей нібыта незавершаная.

— А што адчуў тата, калі ўпершыню ўзяў дачку на рукі?

А.: — Бязмежнае шчасце, пяшчоту, удзячнасць Ксюшы. Я паехаў на гастролі, калі да родаў, па падліках медыкаў, заставалася два тыдні, таму цалкам паспеў бы адвезці жонку ў раддом. Але Эмілька паспяшалася. Я знаходзіўся ў цягніку па дарозе ва Удмуртыю, калі патэлефанавала жонка і сказала, што «хуткая» вязе яе ў радзільню. Я ўжо хацеў вярнуцца дадому, але было прынята рашэнне, што трэба дапрацаваць тур. Так што я прыехаў на ўсё гатовае: жонка і дачка ўжо былі дома (*смяецца*).

— Ксенія, вам не было крыўдна, што ў такі важны момант Андрэя няма побач?

— Дакладна не крыўдна, бо ведала, што выходжу замуж за артыста. Нават не паспела ўсвядоміць, што ўсё атрымалася не зусім так, як марыла, таму што з'яўленне дачкі — гэта такі цуд!

— Паміж вашымі дочкамі розніца шэсць гадоў. Як вы рыхтавалі Эмілію да з'яўлення сястрычкі?

К.: — Нам было лягчэй, таму што дачка гадоў з чатырох сама прасіла сястрычку. Але мы разумелі і тое, што дзіця ўспрымае сястрычку як сяброўку. А насамрэч можа пачацца дзіцячая рэўнасць да малодшай. Таму мы тлумачылі старэйшай дачцэ, што будзем аднолькава любіць яе і малодшую, але вось часу спачатку давядзецца больш аддаваць маленькай. Мне здаецца, вельмі важна, каб старэйшае дзіця было далучана да жыцця малодшага. Цяпер Эмілія можа неяк пазабаўляць Алівію, і тая ёй вельмі рада.

А.: — Алівіі цяпер пяць месяцаў, і калі хтосьці кажа, маўляў, такая малеча нічога не разумее, не веру. Мне здаецца, што дзеці ўсё адчуваюць і разумеюць з моманту нараджэння, а можа, і раней, таму мы як мага часцей даём ім магчымасць адчуваць, што вельмі іх любім.

— Ці праўда, што з другім дзіцем лягчэй, чым з першым?

А.: — Так, таму што ўжо ёсць досвед, менш страху зрабіць нешта не так. Мы жылі самастойна, бабулі не мелі магчымасці часта дапамагаць нам, таму трэба было вучыцца спраўляцца самім.

Наогул, дзеці мяняюць жыццё, прыярытэты, мы рады, што ў нас дзве дачкі. Дзеці — галоўная крыніца натхнення! Яны стымулююць больш працаваць, лепш жыць. Сёлета мы купілі кватэру, заканчваем рамонт, памаленьку абжываемся.

— Ксенія, часам жанчыны крыху раней выходзяць з водпуску па доглядзе дзіцяці, асцерагаючыся адстаць ад калег у прафесійным плане. А як вы вырашылі гэту праблему?

К.: — Для мяне гэта ўвогуле не праблема. Мы вырашылі, што я буду з дачушкамі як і належыць, па тры гады. Гэта той час, калі фарміруецца характар дзіцяці, таму важна, каб бацькі былі побач. Да трох гадоў дзіця можна навучыць асновам самаабслугоўвання. Наша Эмілія наведвае дзіцячы садок, таму што чым раней дзіця пачне кантактаваць з іншымі дзецьмі, тым лепш у яго пройдзе сацыялізацыя. Прафесійныя навыкі можна аднавіць, пашырыць, а калі нешта ўпусціш у выхаванні дзіцяці, гэта ўжо назаўжды.

— Як вы думаеце, дочкі пойдуць па вашых прафесійных слядах?

А.: — Увосень Эмілія пойдзе ў агульнаадукацыйную школу і ў музычную. У яе ёсць цікавасць і здольнасці, дачка добра спявае. Але яшчэ рана казаць, якую прафесію яна выбера потым. У любым выпадку музычная школа лішняй не будзе, заняткі ў ёй — гэта моцная цаглінка ў развіцці асобы. Алівія таксама падае надзеі як вакалістка, калі патрабуе да сябе ўвагі (*смяецца*).

— Ці ёсць у кожнага з вас нейкія пастаянныя хатнія абавязкі?

А.: — Імкнёмся дапамагаць адно аднаму. Домам, вядома, больш займаецца Ксенія, але ўсё, што яна папросіць, я раблю. У нас правіла: усё рабіць лёгка, вось нават сабрацца з двума дзецьмі на прагулку займае нямала часу, але мы не раздражняемся, а жартуем.

— Ці часта ў таты бываюць гастролі? Ці суправаджае яго сям'я?

А.: — Слова «гастролі» мы ўжо забываем... Цяпер канцэрты ў асноўным дома. Для сям'і гэта добра, больш часу разам. Езджу без сям'і, таму што выязны канцэрт — гэта мая звычайная работа. А вось калі ў Мінску выступаю на адкрытай пляцоўцы, то Ксюша і Эмілія заўсёды прыходзяць.

— Хто адказвае за сямейную бухгалтэрыю?

А.: — Грошы ў нас агульныя. Раней рамонт з'ядаў усё, што зарабілялі, але цяпер спадзяёмся вярнуцца да звычайнага ладу жыцця, калі можна колькі-небудзь адкласці на адпачынак.

— А як, дарэчы, вы яго праводзіце?

А.: — У ідэале — паездка на мора. Але я люблю рыбалку, для мяне найлепшы адпачынак — лодка і спінінг. Часам дзяўчаты мяне адпускаюць парыбачыць, і я мчуся да сябра Лявона на Прыпяць ці ў родную Смаргонь. Улетку ўсёй сям'ёй выбіраемся на прыроду. У мяне і Ксюшы дні нараджэння з розніцай у тыдзень, таму ўлетку абавязкова запрашаем сяброў на пікнікі на прыродзе, каб весела і нефармальна адсвяткаваць.

— Што, на ваш погляд, патрэбна, каб шлюб быў моцны, а сям'я шчаслівай?

А.: — Узаемапавага, давер, цярпенне і ўменне саступаць.

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з сямейнага архіва Андрэя УСАНАВА.

МАКСІМАЛЬНАЯ

Навукоўцы Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі — НА ВАРЦЕ ЯКАСЦІ І БЯСПЕКІ

Прафесію метролага нельга назваць шырокавядомай. Самі метралагі кажуць, што іх часам блытаюць з метэралагамі. Між тым у сучасным грамадстве гэтая навуковая сфера неверагодна важная: без дакладнага вымярэння велічынь не абысціся ні ў прамысловасці, ні ў медыцыне, ні ў гандлі. І менавіта метралогія адказвае за тое, каб метр у Беларусі сапраўды быў метрам, а кілаграм — кілаграмам. У наступным годзе Беларускай метралогіі спаўняецца 100 гадоў.

У сучасным свеце ўсё, што вымярае, «завязана» на агульнапрынятых адзінках вымярэння, без якіх немагчымая ацэнка якасці і стану любых рэчывaў або працэсаў, а аснова такой ацэнкі — гэта і ёсць метралогія, навука аб адзінстве вымярэнняў. На пачатку мінулага стагоддзя каля яе вытокаў стаяў сам Дзмітрый Іванавіч Мендзялееў. Увекавечаны ў мармуры, ён сустракае наведвальнікаў у холе Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі. А за яго спінай, у памяшканнях інстытута, захоўваецца 57 нацыянальных эталонаў. Іх дакладнасць — залог правільнай работы вымяральных прыбораў, сістэм, неабходных для складаных высокатэхналагічных вытворчасцяў, бяспекі грамадскага транспарту, камфорту нашага паўсядзённага жыцця.

Дырэктар РУП «Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі» Аляксандр КАЗАЧОК.

УЧОРА І СЁННЯ БЕЛАРУСКАЙ МЕТРАЛОГІІ

20 мая адзначаецца Сусветны дзень метралогіі. У гэты дзень у 1875 годзе ў Парыжы была падпісана «Метрычная канвенцыя» — першае міжурадавае пагадненне ў галіне метралогіі. А найважнейшая дата для беларускіх метролагаў — 29 лютага 1924 года, калі была заснавана Беларуская палата мер і вагаў. Сёння метралагічная служба краіны — гэта разгалінаваная і тэхнічна аснашчаная сетка, якая складаецца з 16 рэгіянальных метралагічных цэнтраў Дзяржстандарту, метралагічных службаў больш за 600 прадпрыемстваў і арганізацый, магутнай эталоннай базы. І Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі, які выконвае функцыі нацыянальнага метралагічнага інстытута, — адно з найважнейшых звёнаў сістэмы забеспячэння адзінства вымярэнняў Рэспублікі Беларусь.

— Сфера дзейнасці інстытута пастаянна пашыраецца і сёння ахоплівае распрацоўку і выраб эталонаў і стандартных узораў, выпрабаванні і высокадакладныя вымярэнні, метралагічную экспертызу, паверку і каліброўку сродкаў вымярэнняў, распрацоўку тэхнічных нарматыўных прававых актаў, выпрабаванні і сертыфікацыю прадукцыі, паслуг, персаналу і сістэм кіравання, даследаванні ў галіне метралогіі і многае іншае, — распавядае **дырэктар БелДІМ Аляксандр КАЗАЧОК.**

Калі ў 1924 годзе, у пачатку сваёй гісторыі, Палата мер і вагаў (яна налічвала тады сем супрацоўнікаў) зверыла 158 тысяч найпрасцейшых прыбораў, то ў мінулым годзе метролагі БелДІМ правялі паверку і каліброўку больш за паўтара мільёна найскладанейшых сродкаў вымярэнняў.

— Адна з найважнейшых падзей для нацыянальнай метралогіі адбылася ў 2020 годзе, — распавядае кіраўнік БелДІМ. — Беларусь стала паўнапраўным членам Генеральнай канферэнцыі мер і вагаў.

ЖЫЦЦЁ ПА ЭТАЛОНЕ

Ільвіная доля нацыянальных эталонаў нашай краіны захоўваецца ў БелДІМ (пры неабходнасці — у спецыяльных памяшканнях з унікальным мікракліматам). Кожны эталон забяспечвае ў сваёй галіне максімальную дакладнасць вымярэнняў у Беларусі, што спрыяе даверу ў адносінах паміж краінамі: у міжнародных навуковых праграмах, сумеснай вытворчасці і гандлі паміж дзяржавамі. На сёння ў Беларусі створана 64 нацыянальныя эталоны — у тым ліку нацыянальны эталон нанасіцыцы (яго 3D-мадэль можна ўбачыць у спецыяльных акулярах).

Вядучы інжынер-мікрабіёлаг Святлана КОСЦЕНЬ.

Над стварэннем яшчэ пяці эталонаў навукоўцы працуюць цяпер. Акрамя таго, ужо існуючыя эталоны перыядычна патрабуюць мадэрнізацыі, напрыклад пашырэння дыяпазону. Таксама вядуцца работы па мадэрнізацыі двух нацыянальных эталонаў. У гэтых работах прымаюць удзел такія навуковыя арганізацыі, як Беларускі дзяржаўны

Вільготнасць кукурузнага зерня даследуе начальнік сектара Вольга СЯЎРУК.

Дослед праводзяць інжынеры-хімікі Уладзіслаў АКУДОВІЧ, Вольга БАШУН, Таццяна ТРУБАЧ.

ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі (які стварае два эталоны) і Інстытут прыкладной фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (які стварае адзін эталон і яшчэ адзін мадэрнізуе).

Адна з найважнейшых функцый БелДІМ — рэгулярнае міжнароднае параўноўванне эталонаў пад эгідай Міжнароднага камітэта мер і вагаў. Мэта такой работы — пераканацца, што беларускія эталоны супадаюць з эталонамі іншых краін.

Не менш важны складнік працы навукоўцаў БелДІМ — праверка дакладнасці работы вымяральных прыбораў. На падставе выпрабаванняў сродкі вымярэнняў уключаюцца ў Дзяржаўны рэестр сродкаў вымярэнняў і стандартных узораў Рэспублікі Беларусь. Па выніках паверак у сярэднім адбракоўваецца 1,3 % сродкаў вымярэнняў, адзначае Аляксандр Казачок.

— Шмат гэта або не, вырашайце самі. Але недакладная работа нават адной адзінкі вымяральных прыбораў можа прывесці і да сур'ёзных фінансавых страт, і нават да пагрозы здароўю і жыццю людзей.

Дарэчы, спецыялісты БелДІМ праяўляюць нават бытавыя вымяральныя прыборы па зваротах грамадзян, напрыклад хатнія танометры.

ДАКЛАДНАСЦЬ

Вядучы інжынер-хімік Сяргей ПІСАРАЎ вызначае хімічныя элементы ў прадуктах харчавання.

Інжынер Наталля ПАБОЖНАЯ ў адным з самых ізаляваных памяшканняў інстытута. Тут пры пастаяннай тэмпературы і вільготнасці паветра беражліва захоўваюць Нацыянальны эталон адзінкі масы.

ВЫТОКІ ДАВЕРУ ДА БЕЛАРУСКАЙ ПРАДУКЦЫІ

Штогод для Міжнароднага дня метралогіі абіраецца важная ў сусветным маштабе тэма. У гэтым годзе такой тэмай сталі «Вымярэнні для падтрымання сусветнай харчовай сістэмы», і абраная яна з-за росту праблем, звязаных з глабальным размеркаваннем харчавання ў свеце. Гарантаваны ўзровень харчовай бяспекі — адзін з асноўных нацыянальных інтарэсаў нашай краіны. Выпрабавальная лабараторыя Нацыянальнага інстытута метралогіі была заснавана ў 1973 годзе як галаўная лабараторыя Дзяржстандарту па кантролі якасці і бяспекі харчовай прадукцыі. Дзякуючы, у тым ліку, яе дзейнасці, беларускія прадукты харчавання сталі па ўсім свеце сіонімам якасці. Давер да натуральнасці і бяспекі беларускай прадукцыі і яе канкурэнтаздольнасць забяспечваюць вытворцы і арганізаваная сістэма кантролю прадукцыі.

— Лабараторыя пастаянна пашырае свае магчымасці ў галіне ацэнкі адпаведнасці сельскагаспадарчай сыравіны, камбікармоў, вырабаў з мяса птушкі, малочнай, мясной, алейна-тлушчавай, рыбнай, сокавай і алкагольнай прадукцыі, дзіцячага харчавання і пітной вады ўстаноўленым патрабаванням, — кажа **начальнік аддзела бяспекі харчовай прадукцыі БелДІМ Наталля ВАШЧУЛА.** — У арсенале лабаратораторыі — высокакваліфікаваны персанал і сучаснае абсталяванне, выкарыстоўваюць вытворцамі аналітычнага прыборабудавання. Гэта дазваляе атрымліваць вынікі вымярэнняў з высокай адчувальнасцю і ўзнаўляльнасцю, каб гарантаваць якасць і бяспеку харчовай прадукцыі.

Пры ўкараненні сучасных метадаў кантролю найважнейшых забруджвальнікаў прадукцыі (пестыцыдаў, мікатаксінаў, антыбіётыкаў, кансервантаў, фарбавальнікаў і г. д.) першарадная роля належыць стандартным узорам, распавядае Наталля Валер'еўна. Гэта хімічныя рэчывы гарантаванай чысціні і іх растворы. Яны выкарыстоўваюцца, у прыватнасці, для кантролю дакладнасці вынікаў даследаванняў.

— Ва ўмовах тэхналогій, якія інтэнсіўна развіваюцца, на рынку з'яўляюцца ўсё новыя і новыя прадукты, у тым ліку далёкія ад натуральных, якія імітуюць знаёмыя смакі і пахі. Бяспека такіх прадуктаў — сумесная адказнасць вытворцаў і дзяржавы ў цэлым, — адзначае спецыяліст.

Інжынер Максім УСЕНКА і вядучы інжынер па метралогіі - даследчык Аліна ДАВІДОЎСКАЯ вызначаюць паказчык белізны мукі.

Пашырэнне магчымасцяў лабараторыі БелДІМ забяспечвае высокі ўзровень аналітычнага кантролю харчовай прадукцыі, вызначэнне мікрабіялагічных паказчыкаў, генетычна-мадыфікаваных кампанентаў, таксічных элементаў, радыенуклідаў, вялікага шэрагу антыбіётыкаў і рэштак лекавых сродкаў у прадукцыі жывёльнага паходжання і больш за 200 пестыцыдаў у раслінной прадукцыі. Лабараторыя рэалізоўвае канцэпцыю глабальнай бяспекі харчовых прадуктаў, з'яўляючыся найважнейшым звяном ланцугу «ад фермы да відэльца», а цеснае супрацоўніцтва з айчыннымі вытворцамі дае магчымасць гарантаваць якасць і бяспеку беларускіх прадуктаў харчавання.

Наяўнасць у лабараторыі высокаадчувальнага сучаснага абсталявання дазваляе таксама ажыццяўляць кантроль прадуктаў харчавання жывёльнага паходжання для ацэнкі іх адпаведнасці стандарту «Халяль».

— Слова «халяль» даўно стала сінонімам таго, што можна ўжываць у ежу мусульманіну. «Халяль» — гэта марка, якая пацвярджае, што прадукты выпрацаваны ў адпаведнасці з ісламскімі традыцыямі, не ўтрымліваюць кампанентаў, якія нельга ўжываць мусульманіну, і з'яўляюцца чыстымі прадуктамі «духоўнага паходжання». З мэтай распаўсюджвання беларускай прадукцыі ў краіны ісламскага свету БелДІМ ажыццяўляе супрацоўніцтва з ТАА «Бел-Халяль», якое мае права выдачы сертыфікатаў адпаведнасці для маркіроўкі тавараў знакам «Халяль», а таксама паўнамоцтвы ажыццяўлення кантролю за выкананнем патрабаванняў да вытворчасці і захоўвання такіх прадуктаў, — распавяла **вядучы інжынер па стандартызацыі і сертыфікацыі Таццяна ЛУЦЭВІЧ.** — Па выніках сумесных аўдытаў сёння беларускім вытворцам выдадзена 67 сертыфікатаў адпаведнасці патрабаванням сістэмы «Халяль «на розныя віды прадукцыі: малочную і мяса птушкі, мыйныя і дэзынфекцыйныя сродкі, упакоўку, дрожджы, цукар, яйкі курыныя і камбікорм для жывёл.

Ацэнка якасці і бяспекі харчовай прадукцыі ў БелДІМ праводзіцца па самых розных крытэрыях. Напрыклад, важным крытэрыем для ацэнкі мукі з'яўляецца яе белізна.

— Белізна — гэта якасная псіхафізіялагічная ацэнка блізкасці колеру аб'екта да белага, і шмат у чым яна суб'ектыўная, — распавядае **начальнік аддзела фізіка-хімічных і аптычных вымярэнняў Аляксей МІРОНЧЫК.** — Гэта прыводзіць да разыходжанняў, а вытворчасць патрабуе аб'ектыўнай, незалежнай ад назіральніка ацэнкі колеру прадукту.

Пад тэрмінам «белізна» ў мукамольнай і хлебапякарнай вытворчасцях разумеецца занальны каэфіцыент дыфузнага адлюстравання ў вобласці спектра ад 510 да 580 нм, дзе назіраецца максімальная для чалавечага вока адчувальнасць, тлумачыць супрамоўца. Гэта значыць, белізну можна вымераць, і гэта забяспечвае ў тым ліку дакладнасць работы белізнамераў мукі розных тыпаў на вытворчасцях, і выключае ўзаемныя прэтэнзіі вытворцы і спажыўца.

Яшчэ адзін найважнейшы паказчык якасці збожжавайпрадукцыі — масавая доля вільгаці збожжа і прадуктаў яго перапрацоўкі.

— Вільгаць вызначае тэхналагічныя і спажывецкія ўласцівасці збожжа і прадуктаў яго перапрацоўкі, а таму строга рэгламентуецца дзяржаўнымі стандартамі, — адзначае Аляксей Міхайлавіч.

У 2019—2020 гадах вытворча-даследчы аддзел фізіка-хімічных і аптычных вымярэнняў БелДІМ рэалізоўваў праграму па распрацоўцы стандартных узораў масавай вільгаці збожжа і зернепрадуктаў. Сёння створаны і актыўна вы-

Эталонны набор гір класа дакладнасці E1.

карыстоўваюцца два дзяржаўныя стандартныя ўзоры: утрымання масавай долі вільгаці ў ячмені і муцэ пшанічнай. Таксама створаны стандартны ўзор белізны мукі.

Амаль стагоддзе беларускія метролагі забяспечваюць дакладнасць вымярэнняў, неабходную для паспяховай дзейнасці як усіх галін эканомікі, так і бяспекі нашага побыту. І важнасць іх работы складана пераацаніць.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 100055197

За перагонкай арганічных растваралнікаў назірае намеснік начальніка аддзела Вольга БАГДАНОВІЧ.

Бацькам на заметку

КАБ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ЗАПОМНІЎСЯ НАДОЎГА

Вашаму дзіцяці хутка пяць, шэсць ці дзесяць гадоў? І вы, канешне ж, у роздумах: як і дзе адзначыць яго чарговы дзень нараджэння? Надакучылі батуты, горкі і клоўны? Хочаце, каб свята было незвычайным і запомнілася надоўга? Пры дапамозе дасведчаных бацькоў мы склалі падборку цікавых ідэй для дзіцячага дня нараджэння.

ІДЭЯ 1. НАВУКОВАЕ ШОУ

Аляксандра на 9-годдзе сына выбрала менавіта гэты варыянт. І нікольі не пашкадавала. Кажа, што навуковае шоу — гэта не проста эфектна і відовішчна, а яшчэ і пазнавальна. «Прычым не толькі дзеці, але і мы, іх бацькі, адкрылі для сябе шмат новага. Асабіста мне спадабалася, што сын і яго сябры не проста сядзелі і глядзелі, як аніматар праводзіць доследы з азотам, сухім лёдам і вуглякіслым газам, а былі актыўнымі ўдзельнікамі дзейства, сапраўднымі стваральнікамі цудаў. Для кожнага доследу да стала з прыборамі выклікаліся памочнікі, так што кожнае дзіця паспела адчуць сябе вучоным. На працягу 45 хвілін юныя эксперыментатары кіравалі маланкамі, дакраналіся да агню, вынаходзілі снег, будавалі віхравую пушку, вырошчвалі ледзяныя скульптуры... Усё гэта абсалютна бяспечна і вельмі цікава. Навуковае шоу — выдатнае выйсце са становішча, калі вы, як было ў нашай сітуацыі, вырашылі запрасіць у госці дзяцей рознага ўзросту і не ведаеце, што прыдумаць, каб усім было цікава. Кожны дослед вядучы тлумачыць на ўзроўні, зразумелым дзецям, якія яшчэ не вывучаюць хімію і фізіку». Аляксандра жыве за горадам, таму запрашала навуковае шоу да сябе дадому. Мая ж іншая знаёмая падзялілася, што яе сына аднакласніца запрасіла на дзень нараджэння ў музей навук «Квантум». Там, дарэчы, можна замовіць не толькі навуковае шоу, але і пазнавальна-забаўляльную экскурсію, якую правядзе аніматар. Найбольшай папулярнасцю цяпер карыстаецца новае магічнае Тэсла-шоу, падчас якога можна перамясціцца ў свет фантастыкі: дакрануцца да маланкі, уключыць лямпачку без правадоў і нават убачыць гук ужывую.

ІДЭЯ 2. КВЭСТ У ПОЎНАЙ ЦЕМРЫ І НЕ ТОЛЬКІ

Год таму мы пісалі пра цэнтр крэатыўных рашэнняў «Нябачны свет», які не так даўно адкрыўся ў Мінску. У ім праводзяцца спаткканні, трэнінгі, канцэрты і іншыя мерапрыемствы... у абсалютнай цемры. Аказваецца, цяпер там можна адзначыць і дзіцячы дзень нараджэння. Новы фармат свята складаецца з дзвюх частак: непасрэдна квэсту ў цемры і чаявання ва ўтульным «Італьянскім дворыку». «Да нас прыходзяць не толькі сталічныя школьнікі, але і сем'і з рэгіёнаў, — распавяла кіраўнік праекта Вольга Палашавец. — Карыстаюцца папулярнасцю гульнявыя квэсты «Дэтэктыўнае агенцтва», «Гары Потэр», «Халоднае сэрца». Кожная з гэтых праграм разлічана на 12 чалавек ва ўзросце 8—12 гадоў. На працягу гадзіны дасведчаныя трэнеры даюць заданні, пры выкананні якіх дзецям прыйдзецца задзейнічаць усе свае пачуцці, акрамя зроку. Хлопчыкі і дзяўчынкі не проста гуляюць, але і вучацца канцэнтравацца на пастаўленай задачы, фантазіраваць, развіваць інтуіцыю, слухаць сябе і іншых, эфектыўна ўзаемадзейнічаць.

Апошнім часам квэсты з арыгінальнымі заданнямі і яркімі паваротамі дэтэктыўнага, гістарычнага ці фантастычнага сюжэта сталі папулярным баўленнем часу сярод дзяцей. Некаторыя з іх можна арганізаваць нават на прыродзе. Сутнасць у тым, што паміж удзельнікамі квэсту спачатку размяркоўваюцца ролі, у кожнай з якіх свая сакрэтная місія. У гульні, як правіла, удзельнічаюць прафесійныя акцёры, якія з'яўляюцца ў самы нечаканы момант і падкідваюць дзецям новыя доказы, ідэі і артэфакты.

Сёння знайсці квэст на любы густ не праблема. Іх прапаноўваюць многія ўстановы для сямейнага адпачынку. У прыватнасці, шмат цікавых квэстаў ладзіць цэнтр акіянаграфіі «Адкрыты акіян». Акрамя таго, ёсць цэлы сайт «Свет квэстаў», дзе вялікі выбар закручаных сюжэтаў на любы ўзрост, прычым квэсты праводзяцца не толькі ў Мінску, але і ў іншых беларускіх гарадах.

ІДЭЯ 3. СТВАРЭННЕ МУЛЬТФІЛЬМА

«Дзень нараджэння — час, калі чакаеш цуду. І ён абавязкова адбудзецца, калі вы зазірняце ў чароўную школу дзіцячай мультыплікацыі «Энфіс», — кажа мама Кацярына. — Мы доўга ламалі галаву, дзе адзначыць свята дачушкі. Яна ў нас дзяўчынка вельмі творчая, любіць ляпіць, маляваць, рабіць аплікацыі. Зусім выпадкова даведаліся, што ў Мінску ёсць месца, дзе дзяцей вучаць ствараць сапраўдныя мультфільмы. Гэта незвычайна, пазнавальна і весела».

У праграму свята ўваходзіць: дэкор памяшкання, забаўляльная праграма з удзелам мультыплікатараў, творчы майстар-клас, падчас якога дзеці пад кіраўніцтвам прафесійнага мультыплікатара ствараюць персанажаў і «ажыўляюць» іх, пакадрава здымаючы сюжэт на сапраўдных мультстанках, малюючы двухфазоўкі, самі агучваюць мультфільм. Акрамя таго, знаёмяцца з тэхнікай «стоп моўшэн», з дапамогай якой дасягаюцца вельмі цікавыя эфекты: ператварэнне аднаго дзіцяці ў іншае, палёты, ажыўленне прадметаў мэблі. У канцы майстар-класа манціруецца кароценькі мультфільм, які абавязкова высылаецца бацькам.

На такіх своеасаблівых уводзінах у прафесію мультыплікатара будзе шмат адкрыццяў і здзіўленняў. Дзеці ўбачаць, што для стварэння просценькага мульціка трэба нямала часу і намаганняў. Не варта непакоіцца, што гасцям вашага імянінніка надакучыць маляваць і назіраць за пакадравай здымкай мультфільма. Прафесійны вядучы чаргуе актыўныя і творчыя моманты падчас майстар-класа.

ІДЭЯ 4. КУЛІНАРНЫ І ІНШЫЯ МАЙСТАР-КЛАСЫ

Сярод творчых майстар-класаў найбольшай папулярнасцю карыстаецца кулінарны. Эмацыянальнае свята, падчас якога дзеці ў фартухах і каўпаках самі гатуюць пачастункі, можна арганізаваць у тым ліку і ў сапраўднай кулінарнай студыі. Дачка маёй прыяцелькі з сяброўкамі, напрыклад, пад кіраўніцтвам прафесійнага кухара рабілі піцу. А потым частавалі ёй сваіх бацькоў. Акрамя піцы, можна прыгатаваць сушы і салодкія ролы, шакаладныя бісквіты на палачцы і іншае. Гэты фармат свята не толькі смачны, але і вельмі фотагенічны. Дарэчы, падобная ідэя апошнім часам карыстаецца папулярнасцю і сярод дарослых.

Выбар творчых майстар-класаў, у прыватнасці ў адным са сталічных сямейных цэнтраў, вельмі вялікі. Найбольш арыгінальнымі падаліся роспіс футболак і сумак-шопераў, лепка з цукровай мастыкі, мылаварэнне і выраб гелевых свечак, маляванне пяском з бутэлькі, слаймы сваімі рукамі, дэкор у тэхніцы дэкупаж, выраб «лаўцоў сноў», вінтажны роспіс посуду. Прынамсі я хацела б, калі сын крыху падрасце, зладзіць яго дзень нараджэння ў ганчарнай майстэрні. Мае знаёмыя вадзілі на падобны майстар-клас за ганчарным колам сябровак сваёй дачкі. Усе засталіся ў захапленні. Творчыя майстар-класы цікавыя яшчэ і тым, што на памяць кожнаму госцю застаюцца сувеніры, зробленыя ўласнымі рукамі.

ІДЭЯ 5. ЗАПРАСІЦЕ ТЭАТР ДА СЯБЕ

Нядаўна я была на дні нараджэння ў сваёй хрэсніцы. Яе бацькі замест больш звыклых аніматараў запрасілі на свята... сапраўдны мабільны тэатр. Сямейная пара ставіла на імправізаванай сцэне спектакль «Церамок». Ён аказаўся вельмі інтэрактыўным, таму дзеці былі не проста гледачамі, а і непасрэднымі ўдзельнікамі казачнай гісторыі. Думаю, у кожным горадзе знойдуцца падобныя самадзейныя артысты, якія з задавальненнем прынясуць казку на дзень нараджэння вашага малога.

ІДЭЯ 6. ВЕЧАРЫНА Ў ФОТАСТУДЫІ

Больш падыходзіць для дзяўчынак-падлеткаў, якія любяць пазіраваць і мяняць вобразы. Збярыце некалькі сябровак з разнастайнымі ўборамі, прывядзіце ў прафесійную фотастудыю, няхай пагуляюць у фотамадэляў. Фотавечарыну, як правіла, праводзяць вядучая, візажыст-цырульнік і фатограф.

ІДЭЯ 7. БЯСПРОЙГРЫШНАЯ: УСЁ ПРЫДУМАЦЬ І ЗРАБІЦЬ САМІМ

Калі ў вас, мамы і таты, ёсць арганізатарскія здольнасці і крыху вольнага часу, вы, безумоўна, справіцеся лепш за ўсіх. Бо менавіта вы, як ніхто, ведаеце, што падабаецца вашаму дзіцяці і выкліча ў яго найбольшае захапленне. Як варыянт, можна распрацаваць сцэнарый ці той жа квэст па матывах яго любімай кнігі ці камп'ютарнай гульні. Ідэі для афармлення пакоя, упрыгажэння стала, рэцэпты дзіцячых святочных страў, гульні, конкурсы можна пашукаць у інтэрнэце і адаптаваць пад сябе.

Дарэчы, калі вы святкуеце дзень нараджэння дома і ў вас няма магчымасці запрасіць навуковае шоу, можна прыўнесці ў сваё свята асобныя яго элементы. Шмат падказак знойдзеце ў інтэрнэце, увёўшы ў пошук «простыя эксперыменты для дзяцей». Напрыклад, мы з сынам рабілі дослед «Як незвычайным чынам надзьмуць шарык». Насыпалі ў паветраны шарык дзве чайныя лыжкі соды. У пластыкавую бутэльку акуратна налілі 3 сталовыя лыжкі воцату. Затым нацягнулі шарык з содай на гарлавіну бутэлькі і высыпалі соду ў воцат. Шарык пачаў паступова надзімацца. (Пры змешванні соды і воцату ўзнікае хімічная рэакцыя, у выніку якой выдзяляецца вуглякіслы газ. Яго становіцца ўсё больш і больш, ён не можа змясціцца ў бутэльцы і выходзіць з яе, трапляючы ў шарык.)

Цудоўная ідэя адсвяткаваць дзень нараджэння на прыродзе. А яшчэ лепш — пайсці ў паход з начлегам, асабліва калі вы сябруеце сем'ямі. Там дзецям можна павучыцца пры дапамозе бацькоў распальваць вогнішча, смажыць сасіскі на палачцы, вудзіць рыбу, раскладваць палатку...

Ну а завяршыць святкаванне можна вясёлай мексіканскай традыцыяй. Для гэтага трэба купіць альбо зрабіць сваімі рукамі з пап'е-машэ піньяту. Гэта вялікая полая цацка, якую напаўняюць цукеркамі, дробнымі падарунчыкамі, серпанцінам і канфеці. Піньяту звычайна падвешваюць на галіну дрэва, і дзеці па чарзе спрабуюць разбіць цацку палкай. Фігурка можа быць любой формы, чым ярчэй, тым лепш. У інтэрнэце шмат майстар-класаў па вырабе такой цацкі і відэа з пакрокавымі фотаінструкцыямі. Складана? Але ж дзіцячы дзень нараджэння гэтага варты!

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

ПАВАДОК, ЖЭТОН І ЛЮДЗІ З СЭРЦАМ...

Што рабіць, каб ваш сабака не ўцёк, і што — каб яго знайсці

Штогод толькі ў сталіцы і Мінскай вобласці губляецца амаль тры тысячы сабак, дадому вяртаецца прыкладна палова з іх. Пры гэтым рэальная лічба згубленых хатніх гадаванцаў значна большая, а названая колькасць — тыя, хто трапіў у групу «Зніклыя і знойдзеныя сабакі. Мінск і вобласць». Гэта, пэўна, самая вялікая з тэматычных груп, дзе сабрана інфармацыя пра жывёл, якіх шукаюць і знаходзяць па ўсёй Міншчыне. У тым, што чатырохлапы член сям'і губляецца, заўжды (за рэдкім выключэннем, калі чалавеку стала кепска і ён страціў прытомнасць) вінаваты яго гаспадар, упэўнена Ала РОЎБА, адміністратар групы. Яна расказала, як дзейнічаць, калі ваш сябар згубіўся, і як гэтага не дапусціць.

Шукаць самому, клеіць аб'явы, звяртацца ў міліцыю

Група «Зніклыя і знойдзеныя сабакі. Мінск і вобласць» з аднайменнымі назвамі ёсць ва ўсіх сацыяльных сетках і месенджарах, і яна пэўным чынам аб'ядноўвае ўсе дробныя суполкі. Так што першае, што трэба зрабіць, калі вы згубілі свайго гадаванца, — закінуць аб'яву ў групу.

— Неабходна ўказаць пол сабакі, дзе, калі згубіўся, дадаць фота гадаванца і свой кантактны нумар. Інфармацыя распаўсюдзіцца па ўсіх сетках, і мы будзем маніторыць, ці не з'явіцца дзе пра яго звесткі, — параіла Ала Роўба. — Мы намагаемся адсачыць і далейшы лёс сабакі: што ён знайшоўся або трапіў да новых гаспадароў. Ну, і чалавеку варта таксама маніторыць сеткі.

Але не толькі. Неабходна непасрэдна шукаць сабаку. Падымаць сваіх знаёмых і «прачэсваць» тэрыторыю ў радыусе некалькіх кіламетраў ад месца, дзе згубіўся чатырохногі. Падыходзіць да мінакоў, паказваць фота гадаванца.

Калі за суткі сабака не знайшоўся — друкуйце аб'явы і абклейвайце свой раён у месцах найбольшай праходнасці: крамы, школы, транспартныя прыпынкі, месцы выгулу, слупы на скрыжаваннях. Не ўсе сядзяць у інтэрнэце, магчыма, нехта адгукнецца і на папяровы варыянт або зробіць фота і вылажыць у сеціва, дзе яго ўбачыць яшчэ больш людзей.

Калі прайшло дзён пяць, а сабака не знайшоўся, трэба пісаць заяву ў міліцыю, асабліва калі гадаванец невялічкі і пародзісты, раіць Ала Роўба:

— Дробныя пароды сёння вельмі папулярныя, і некаторыя проста могуць пакінуць гадаванца сабе, бо, на іх думку, будуць лепшымі гаспадарамі ці проста палічаць, што сабаку выгналі і яна нічыйная. Вядома, міліцыянеры не будуць шукаць вашу сабаку, але могуць неяк скіраваць вас. А бывае, што некаторыя знаходзяць сабаку і прывозяць яго ў міліцыю. Заява стане і доказам на вашу карысць, калі ўцякач знойдзецца праз нейкі час у чужых руках.

Звяртацца ў міліцыю рэкамендуецца і тым, хто знайшоў сабаку, каб пасля не быць абвінавачаным у крадзяжы. Права вярнуць сваю маёмасць (менавіта маёмасцю лічацца па законе сабакі) у гаспадара ёсць на працягу шасці месяцаў, а заява будзе страхоўкай і для новага гаспадара, і для папярэдняга, акцэнтавала ўвагу адміністратар групы.

Згубіцца можа кожны

Ад уцёкаў не застрахаваны ніводны сабака, незалежна ад памеру, выхавання ці ўмення гуляць без павадка, сцвярджае Ала Роўба:

— З павадка сабаку спускаць нельга! Гэта правіла выгулу сабак. Калі мне кажуць, што сабаку ўжо дзесяць гадоў і ён быў паслухмяны, а тут раптоўна ўцёк, я заўжды нагадваю, што спрагназаваць сітуацыю немагчыма. Ваш паслухмяны сабака ідзе побач з вамі, а насустрач — буйны сабака ці ў небе праляцеў самалёт, ці хлопчыкі непадалёк узарвалі петарду... Стрэсам можа стаць што заўгодна, і ваш гадаванец уцячэ.

Другі абавязковы момант — наяўнасць адрасніка, або жэтона з інфармацыяй пра сабаку. У прынцыпе, павінен быць і чып, але ж каб праверыць інфармацыю па ім, трэба «напружыцца» — злавіць сабаку, завесці яго ў спецыяльную ўстанову, каб прачытаць звесткі пра яго. А на адрасніку ўбачыць даныя — справа хвіліны.

Адраснік можа быць абсалютна любы: пластыкавы, металічны, з гравіроўкай. Галоўнае, каб было імя сабакі і ваш нумар. Можна проста скотчам наклеіць паперку з данымі. Вешаць жэтон лепш не на ашыйнік, а на вяроўку, якая павінна быць на шыі вашага гадаванца заўжды.

Больш шанцаў у пародзістых і гарадскіх

Знайсціся сабака можа і праз месяц, і праз тры. Былі выпадкі, што гадаванца вярталі і праз тры гады, абнадзеіла адміністратар групы:

— Зусім нядаўна знайшлася аўчарка, якая згубілася ў 2017-м. Валанцёру запомнілася, што ў сабакі адсутнічаў клык, і такога знайшлі ў вёсцы, дзе ён прыбіўся да новых гаспадароў. У вёсцы знайсці сабаку значна менш шанцаў, чым у горадзе. Можа, у гарадах людзі больш камунікуюць і карыстаюцца інтэрнэтам... Больш верагоднасці адшукаць свайго сябра і ў гаспадароў пародзістых сабак — іх на вуліцы заўважаюць часцей. «Шэрыя мышкі»-дварнякі застаюцца амаль нябачнымі. З іншага боку, пародзістага сабаку часцей могуць скрасці.

У кожнага знойдзенага сабакі свая гісторыя, але заўсёды — гэта вялізнае шанцаванне. Аднойчы ў людзей на вясковым участку пад Мінскам згубіўся баксёр, яго не маглі адшукаць некалькі дзён, ніхто яго не бачыў. Гаспадары за гэты час падабралі дварняка, які таксама згубіўся, і прывезлі да сябе. І той адразу прывёў людзей да выграбной ямы, куды зваліўся баксёр, зламаў лапу і яго прысыпала зверху галлём, а сам ён не падаваў гукаў. Як сказаў ветэрынар, яшчэ суткі — і сабака памёр бы ад абязводжвання. У другой гісторыі людзі знайшлі сабаку, і пакуль шукалі гаспадароў, да іх у двор прыйшла ліса (пасля аказалася, што яна шалёная) і кінулася на гаспадара. Чалавека выратаваў падабраны сабака, і яго пакінулі сабе.

Як Сняжка шукалі

Напрыканцы сакавіка з-за сваёй неабачлівасці я стала гаспадаром уцекача і на сваёй скуры адчула, што гэта такое. Мой сабака звычайна жыве ў вёсцы, але сёлета зімаваў з намі ў горадзе. На прагулках іншыя сабачнікі смяяліся: маўляў, «адпусці яго пабегаць, сабака ж немаленькі, яму трэба лапы размяць». Паддаўшыся на такія размовы, я, хоць і баялася, пачала раз на тыдзень хвілін на 15 спускаць Сняжка з павадка. Кожны раз сэрца трывожна грукала, калі ён збочваў са сцежкі і знікаў у лесе, але ж я была ўпэўнена, што яму карысна пабегаць. І вось аднойчы мой сабака радасна рванўў наперад — і толькі яго і бачылі!

Прайшло 15 хвілін, паўгадзіны, я гукала на ўвесь лес — цішыня. Праз дзве гадзіны пайшла дахаты змяніць абутак, які змок ад бадзяння па лесе. Уцёк Сняжок 28 сакавіка, тады якраз усё моцна заснежыла. У абед напісала ў наш мясцовы чат пра сваю страту. Адразу адказалі, што бачылі яго каля дамоў. Кінулася туды — няма. Шукала да цямна. Абышла ўсе месцы, дзе мы гулялі. (Потым аказалася, што рабіла правільна — трэба абыходзіць усе звыклыя для вас з сабакам маршруты.) Вярнулася дахаты, а ў галаве думкі: што Сняжок еў, дзе будзе спаць?

З раніцы зноў на пошукі. У абед атрымала паведамленне, што яго бачылі ў лесапаласе на вуліцы Герасіменкі. Ад нашага мікрараёна Сосны гэта кіламетраў дзесяць. Не можа быць? Можа. Даслалі фота — гэта быў Сняжок. Першая думка — жывы! Пакуль я туды даехала, бегала, шукала і гукала... Не знайшла. Развесіла раздрукаваныя аб'явы па сваім раёне і на Герасіменкі. Бегала без канца. Увечары другога дня зразумела, што за гэты час нічога не ела...

Ала Роўба ўжо размясціла інфармацыю пра Сняжка ў групе, я дадалася ва ўсе магчымыя чаты. Мне дапамагала шмат нераўнадушных. Святлана хадзіла пешшу па Байкальскай і Ангарскай, з ёй мы амаль у 11 ночы прачэсвалі лес. Вольга са Сціклева аб'язджала раён на машыне. Ірына з Сосен дапамагала шукаць групы і размяшчаць інфармацыю пра Сняжка... І такіх людзей з сэрцам вельмі шмат. Калі нехта разам з табой перажывае і падбадзёрвае, расказваючы, як знаходзіліся іншыя, гэта падтрымлівае надзею, дае сілы для пошукаў.

На пяты дзень паехала паспытаць шчасця на Трасцянецкі палігон. І мне пашанцавала! З прахадной выйшаў цудоўны чалавек Юра, які ўпэўнена сказаў, што Сняжок тут ранкам прабягаў..

Пайшла шукаць. Было страшна, бо бадзяжных сабак тут шмат. І калі ўжо збіралася вярнуцца назад, раптам убачыла: на траве ляжыць сабака, вельмі падобны да Сняжка. За час пошукаў у розных месцах я траіх такіх бачыла, вельмі падобных. Набліжаюся, клічу, ніякай увагі. І тут ён мяне пазнаў, ускочыў, кінуўся — мой! Не пагрызены, толькі брудны. Момант, калі ён да мяне дабег, я запомню назаўжды. Цяпер, вядома, сабаку з павадка не адпускаю і лічу, што мне вельмі моцна пашанцавала, бо не адбылося вялікай бяды. Не губляйце сваіх сяброў, бо гэта вельмі балюча.

Ірына СІДАРОК,
фота аўтара.

Не аддавайце ў прытулак на Гурскага

Многія лічаць, што знойдзенаму сабаку дапамогуць у сталічнай «Фаўне горада». Аднак лепш не спяшацца адвозіць яго на вуліцу Гурскага, бо там лёгка падхапіць інфекцыю, кажа Ала Роўба:

— Новыя жывёлы вельмі хутка заражаюцца інфекцыямі, на барацьбу з якімі ў арганізацыі няма ні сіл, ні ўмоў, нават калі б і хацелі. Энтэрыт, напрыклад, жыве паўтара года ў памяшканні і пранікае на паўтара метра ў зямлю. Інфекцыя амаль заўжды смяротная для жывёл.

Жэсаўскі жэтон не дапаможа

Калі вы рэгіструеце сабаку ў ЖЭС, вам выдаюць жэтон з нумарам, які павінен вісець на ашыйніку. Многія гаспадары лічаць, што па ім можна лёгка знайсці сабаку. Гэта не так, запэўніла Ала Роўба:

— Не існуе ніякай адзінай базы, каб па ёй знайсці ўладальніка. Каб адшукаць яго па жэтоне, трэба ісці ў ЖЭС, дзе ўпрошваць, каб работнік уручную праверыў гэты нумар. Больш за тое, высветліць, якому раёну Мінска належыць жэтон, можна толькі ў «Фаўне горада». А колькі ЖЭСаў у раёне? Так што пошук становіцца на 99 % бессэнсоўным.

Асабістае

«ЛАЙКІ» БЫВАЮЦЬ ЖОРСТКІМІ

Неяк мы з жонкай наведалі масавае мерапрыемства, якое ладзілася на цэнтральнай плошчы нашага горада. Паглядзець было на што, але маю ўвагу прыцягнула адна «карціна», звычайная і бяскрыўдная на першы погляд. Некалькі дзяўчынак, прыкладна 11—13 гадоў, здымалі сябе на відэа. Адна з іх трымала ў выцягнутай руцэ тэлефон, і ўсе яны, адначасова і па чарзе, стараліся неяк вылучыцца на камеру. То нешта, захлёбваючыся, расказвалі, то падтанцоўвалі, то абдымаліся і гучна смяяліся...

Вядома ж, нічога дрэннага ў гэтым не было. У апошнія некалькі гадоў мы можам назіраць такія здымкі вельмі часта. Моладзь імкнецца вылучыцца і прыцягнуць да сябе ўвагу ўсімі магчымымі спосабамі. А розныя сучасныя платформы ў інтэрнэце даюць для гэтага вялізную магчымасць.

Здавалася б, за што тут хвалявацца? Але я, працуючы шмат гадоў у школе, ужо даўно займаюся рознымі назіраннямі ў дадзенай галіне. Для гэтага прыйшлося дасканала авалодаць сродкамі інтэрнэт-сувязі, праз якія маюць зносіны дзеці. Ёсць відэа, калі яны ў прамым эфіры перад камерай камп'ютара, тэлефона нешта расказваюць і дэманструюць. І тут жа адразу могуць бачыць каментарыі, якія ім пішуць гледачы. У іншых выпадках падлетак запісвае відэа ці фота і выкладвае яго на сваіх старонках у інтэрнэце. Сутнасць такіх відэа — «зачапіць», зацікавіць, прыцягнуць увагу гледача любым спосабам, бо менавіта ад гэтага залежыць, ці будуць праглядзі, ці паставяць тыя, хто глядзіць, такія жаданыя лайкі. І няма мяжы колькасці гэтых лайкаў. Дзецям заўсёды іх трэба больш і больш. Часта гэтая колькасць вызначае статус дзіцяці сярод аднагодкаў.

Мне ж хочацца вызначыць праблемы, да якіх прыводзіць такое захапленне. Справа ў тым, што ўсе дзеці маюць свае матэрыяльныя мары і жаданні. Дзіця нашага часу ўжо з малых гадоў добра разумее, што для іх дасягнення патрэбны сродкі. Адначасова на прасторах інтэрнэту розныя блогеры зарабляюць вялізныя грошы, здымаючы відэа. І не мае значэння, якое гэта відэа. Неяк, будучы ў Магілёве, каля аднаго з гандлёвых цэнтраў назіраў за паводзінамі двух падлеткаў. Адзін з іх на тэлефон здымаў свайго сябра, а той у сваю чаргу... жаваў пачак з цыгарэтамі, які трымаў у руцэ! Пасля яны на камеру спыталі аб тым, што ім з'есці наступным разам, і са смехам збеглі. Я і некалькі жанчын, якія бачылі ўсё гэта, засталіся ў разгубленасці. Мы ўсе стаялі і не разумелі: няўжо гэта нармальна?

Яшчэ адна праблема заключаецца ў тым, што падлеткі, якія падоўгу маюць зносіны ў інтэрнэце, вельмі часта дыстанцыруюцца і забываюць пра рэальныя зносіны са сваімі аднагодкамі. І калі гэта працягваецца доўга, то сітуацыя пагаршаецца. У канчатковым выніку зносіны зводзяцца толькі да віртуальнай версіі. Для дасведчанага педагога такіх дзяцей звычайна выявіць нескладана. Як правіла, яны маўчуны. У кампаніі аднагодкаў ім складана і нязвыкла мець зносіны, яны рэдка займаюць лідарскія пазіцыі. Такія дзеці бываюць раздражняльнымі і цяжка ідуць на кантакт. Часта бацькі могуць нават не разумець, што адбываецца з іх сынам або дачкой, чаму яны паводзяць сябе неадэкватна... Неяк наткнуўся на артыкул аб адной амерыканскай дзяўчынцы. У школе яна пасварылася са сваімі аднакласніцамі. Увечары іх зносіны прадоўжыліся ў выглядзе перапіскі ў інтэрнэце. Перапіска не заканчвалася да раніцы. Аднагодкі зневажалі і даводзілі яе як маглі. (Паверце, дзеці могуць быць вельмі жорсткімі, асабліва натоўпам.) Пад раніцу дзяўчынка скончыла жыццё самагубствам, парэзаўшы сабе вены. Але ж гэтай трагедыі можна было б пазбегнуць....

Летась я гутарыў з адным хлопчыкам з 8 класа. Пацікавіўся, чаму ён аддае перавагу віртуальным зносінам з аднагодкамі, а не рэальным. Хлопец адказаў, што ў інтэрнэце ён можа вельмі хутка выбіраць і мяняць сяброў. А таксама называцца кім заўгодна, прыпісваючы сабе любыя якасці. І наогул, «там» можна казаць і рабіць, што захочаш, і за гэта звычайна нічога не бывае.

Таму шчыра падтрымліваю ўсе законы, што прымаюцца ў нашай краіне для кантролю дзеянняў у сетцы інтэрнэт самых розных карыстальнікаў. У асноўным гэта дапамагае стрымліваць хаос і негатыўную інфармацыю, якой хочуць нашпігаваць нашых дзяцей.

А яшчэ хачу звярнуцца да бацькоў: калі ласка, цікаўцеся часцей, чым жывуць вашы дзеці. Кантактуйце з педагогамі, якія іх выхоўваюць і вучаць. Спадзяюся, што разам мы зможам значна зменшыць магчымыя рызыкі і пазбегнуць самага страшнага.

Анатоль АСКІРКА,
настаўнік пачатковых класаў ДУА «Навабыхоўская сярэдняя школа».

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Блінцы з сырам і зяленівам

Спатрэбіцца: *яйка — 3 шт.; смятана — 250 г; малако — 150 мл; мука — 100 г; сыр — 100 г; зяленіва — на смак (кроп, пятрушка, цыбуля зялёная, кінза, базілік, сельдэрэй ліставы і іншае).*

Змешваем у ёмістасці смятану (можна замяніць мяккім тварагом, грэчаскім ёгуртам) з яйкамі да аднастайнасці калатоўкай або блендарам. Дадаём муку, малако, сыр і зяленіва, зноў змешваем. Выпякаем на разагрэтай з маслам патэльні з двух бакоў да гатоўнасці. Гэтыя блінцы можна есці нават без нічога — такія яны смачныя. А можна, зразумела, і з маслам ці смятанай.

Хатні сыр з зяленівам і кменам

Спатрэбіцца: *кефір — 1 л, малако — 1 л, яйкі — 6 шт., соль — 4 ч. лыжкі (або на смак), чырвоны востры перац — 1/3 ч. лыжкі, крыху кмену, часнок — 1 зубок, невялічкі пучок зяленіва: кроп, кінза, зялёная цыбуля.*

У рондаль выліць малако і кефір, паставіць на пліту. Не даводзячы да кіпення, уліць тонкім струменьчыкам у гарачую малочна-кефірную сумесь злёгку ўзбітыя з соллю яйкі. Давесці да кіпення і варыць гэтую сумесь, памешваючы, на невялікім агні, некалькі хвілін да моманту аддзялення сыроваткі.

Зняць з агню, даць астыць 1-2 хвіліны і дадаць здробненае зяленіва, кмен і чырвоны перац, выціснуць зубок часнаку. Выліць масу ў друшляк, высланы марляй, складзенай у два пласты. Закруціць марлю вузлом, даць сцячы сыроватцы. Потым марлю раскруціць. Круглячок сыру, які ўтварыўся, прыкрыць краем марлі, зверху пакласці сподак і паставіць на яго які-небудзь груз (падыдзе, напрыклад, слоік з вадой, закрыты вечкам).

Прыбраць у халадзільнік на некалькі гадзін (лепш на ноч). І раніцай можна каштаваць.

Торцік з чарнаслівам без выпечкі

Спатрэбіцца: *печыва (напрыклад, «да чаю») — 24 штукі + на абсыпку, смятана — 5 ст. л., тварог — 250 г, чарнасліў без костачкі — 100 г, цукровая пудра — 3 ст. л., масла размякчанае — 100 г, заварэная кава (па жаданні) — 100 мл, какава-парашок для ўпрыгожвання.*

Чарнасліў заліваем кіпенем і даём распарыцца, затым наразаем дробна. Змешваем тварог з цукровай пудрай і смятанай. Даём размякчанае масла.

Высцілаем форму плёнкай і выкладваем пласт печыва. (Па жаданні можна хутка абмакнуць печыва ў каву.) Змазваем яго творожнай начынкай і выкладваем чарнасліў. Зноў пласт печыва, начынка, чарнасліў, паўтараем пласты. Апошні пласт — печыва.

Асцярожна пераварочваем на блюда, здымаем плёнку, абмазваем творожным крэмам верх і бакі. Пасыпаем верх какавай, а бакі здробненым печывам.

Даём торту пастаяць не менш за дзве гадзіны.

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

ЯК ЗАХАВАЦЬ ЗРЭЗАНЫ БЭЗ

Цяжка ўявіць прыход вясны без водару бэзу. Пах гэтых кветак разносіцца на сотні метраў, а ў вячэрні час адчуваецца асабліва востра. Нядзіўна, што букет бэзу хочацца захаваць даўжэй. І зрабіць такое цалкам рэальна.

Ваза для бэзу павінна быць такой, каб букет свабодна ў яе змясціўся. Калі кветкам будзе цесна — яны доўга не пражывуць.

Суквецці любяць ваду, і за дзень у вазе можа стаць амаль суха. Таму неабходна рэгулярна правяраць яе запаўненне і дадаваць прахалодную ваду.

Букет зможа прастаяць у вазе да трох дзён.

ЗРЫВАЕМ ПРАВІЛЬНА

Не варта ламаць галінку рукамі. Лепш скарыстацца вострым нажом. Зрэз трэба рабіць наўскасяк.

Ідэальным часам для нарэзкі бэзу з'яўляюцца ранішнія гадзіны, калі гарачыня яшчэ не наступіла. У кветках у згаданы перыяд сутак змяшчаецца максімальная колькасць вільгаці. Гэта дапаможа зрэзаным суквеццям захаваць свежасць даўжэй.

Абрэзаць варта тыя галінкі, на якіх раскрылася большасць кветак. Калі яны ўсе ўжо даўно распусціліся — няхай застаюцца на кустах.

Нядрэнна куст бэзу з вечара шчодра паліць вадой.

Калі галінкі ставяць у вазу не адразу, трэба падрыхтаваць вільготную тканіну і загарнуць у яе зрэзы сцёблаў. Дадаткова букет варта абматаць мяккай паперай. Усё гэта паспрыяе таму, што бэз будзе дастаўлены да месца прызначэння ў выдатным стане.

ЗАХАВАННЕ Ў «АСОБАЙ» ВАДЗЕ

Букет кветак захаваецца амаль на тыдзень, калі паставіць яго не ў звычайную ваду, а ў падкісленую. Дадаванне некалькіх кропель воцату ці лімоннай кіслаты змякчыць вадкасць. Тым самым жыццё бэзу будзе працягнута.

Існуюць і іншыя варыянты падрыхтоўкі жыватворнай вадкасці. У ваду можна дадаць:

цукар (сталовую лыжку на літр вады);

таблетку аспірыну (ацэтылсаліцылавай кіслаты).

Ваду трэба мяняць штодня, дадаючы названыя рэчывы.

Бэз зможа прастаяць да дзесяці дзён, захоўваючы свежасць, калі скарыстацца такімі рэкамендацыямі:

1. Зразаем галінкі з кветкамі, таўсцейшыя і даўжэйшыя.
2. Кіпяцім ваду ў той колькасці, якую зальём у вазу.
3. Наліваем крыху кіпеню на дно ёмістасці, каб яна адаптавалася да высокай тэмпературы і не лопнула.
4. Напаўняем вазу гарачай вадой амаль напалову.
5. Змяшчаем у яе букет бэзу. Папраўляем галінкі так, каб яны свабодна стаялі ў вазе.

Ваду мяняць не трэба. Але варта даліваць злёгку цёплую па меры таго, як бэз яе выпівае. Абавязкова трэба сачыць за тым, каб сцёблы былі цалкам пакрытыя вадой.

РАЗМЯШЧЭННЕ БУКЕТА

Для букета бэзу важна выбраць правільнае месца. Кветкі дрэнна пераносяць уплыў прамых сонечных прамянёў. Пад іх уздзеяннем бэз завяне нашмат хутчэй. Таму для яго трэба знайсці месца далей ад сонца.

У сабраных на вуліцы кветках могуць хавацца насякомыя, небяспечныя для пакаёвых раслін. Букет бэзу трэба паставіць ад іх далей.

Кветкі надзеленыя дастаткова моцным пахам. Калі, акрамя бэзу, у пакоі ёсць іншыя духмяныя букеты, іх лепш «рассяліць» у рознымі памяшканні. Водар, прыемны сам па сабе, у спалучэнні з іншым, не менш моцным, можа ператварыцца ў непераносны.

ХУТКАЯ ДАПАМОГА

Падоўжыць жыццё зрэзанага бэзу можна, калі:

• Апырскваць кветкі вадой пакаёвай тэмпературы.

• Злёгку завялыя сцёблы акунуць зрэзамі ў ваду і наўскасяк крыху зрэзаць. Вымаць іх з вадкасці не рэкамендуецца.

• На ноч даліць у вазу ваду і глыбей пагрузіць у яе букет. На паверхні павінны заставацца толькі суквецці. Зверху прыкрыць букет вільготнай паперай. Такія маніпуляцыі дапамогуць захаваць вільгаць у галінках бэзу.

• Тыя суквецці, якія толькі злёгку «засумавалі», можна ажывіць. Неабходна набраць у ёмістасць гарачую ваду (70-80 градусаў) і акунуць у яе галінкі. Не пройдзе і гадзіны, як бэз зноў стане свежы.

І ГАЛУБОК ГУКАЕ, ЯК ПАРУ ШУКАЕ (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).

НАШ МІНІМАЛЬНЫ НАБОР

СПАЖЫВЕЦКІ КОШЫК — ПЕРАЖЫТАК СССР?

І так, і не. Такі «кошык» сапраўды быў у СССР, а наша краіна самастойна фарміруе яго з 1992 года.

Спажывецкі кошык як пэўны сацыяльна-эканамічны інструмент прымяняецца практычна ва ўсіх краінах: дзесьці «кошык» багацейшы за наш, а дзесьці — больш сціплы.

Некаторыя лічаць, што ў прадуктовым кошыку няма ніякіх «празмернасцяў» у выглядзе шакаладу ці садавіны. Але гэта памылка. Напрыклад, мужчыне і жанчыне ад 18 гадоў да пенсіённага ўзросту ў «кошык» «пакладзены» 51,1 кг садавіны ў год, хлопчыку ва ўзросце 13 гадоў — 69,4 кг, дзяўчынцы ва ўзросце 8 гадоў — 54,8 кг. Дададзім да гэтага сухафрукты — адпаведна 8 кг для мужчын, 7,5 для жанчын, 9,1 для хлопчыкаў і 7,3 для дзяўчынак. Улічана ў кошыку і гародніна, пры гэтым на бульбу, буракі, капусту, моркву, зяленіва, агуркі, таматы ёсць асобныя нормы і агульная лічба на «іншую гародніну». Прадугледжаны гароднінныя кансервы і фруктовыя сокі.

Кандытарскіх вырабаў больш за ўсё прапануецца мужчынам — 21 кг, жанчынам — толькі 12,5, хлопчыкам — 19,3, дзяўчынкам — 8,6 кг.

Здаецца, малавата чаю: 0,8 кг мужчыну і ўсяго толькі 0,1 кг дзяўчынцы. Какава, кава наогул адсутнічаюць у прадуктовым кошыку.

Зрэшты, прадуктовы набор прадугледжаны для сям'і з чатырох чалавек, так што чай трапіць у агульны імбрык.

БЕЗ НАСОЎКІ — НІКУДЫ!

Чатыры гады мужчынам прапануецца насіць адну зімовую і адну дэмісезонную куртку, а вось касцюмаў на гэты ж тэрмін прадугледжана два. Дададзім да іх па дзве пары туфляў, звычайных і летніх, на такі ж перыяд. На тры гады павінна хапіць чатырох маек, столькі ж трусоў на год, а вось шкарпэтак — аж сем пар. Раз у два гады мяняюцца хатнія тапкі. Больш ніякага адзення з катэгорыі хатняга, як і піжамы для мужчын, не прадугледжана. Хіба што ў якасці хатняга адзення выкарыстоўваць спартыўны гарнітур — адзін на тры гады. Усяго ў спісе мужчынскага адзення і абутку 27 пазіцый, сярод якіх нават насоўкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЖАНЧЫНЫ ШТАНЫ НЕ НОСЯЦЬ?

Колькасць і тэрміны нашэння вопраткі (верхняга адзення) у жанчын супадаюць з мужчынскімі. Жанчынам «пакладзены» ў «кошык» два касцюмы і дзве спадніцы на тры гады, дзве блузкі на два гады, дзве сукенкі на 2,5 года. Штаноў у жаночым кошыку няма наогул, хоць гэты від адзення папулярны ў кабет. Праўда, як і ў мужчын, ёсць джынсы — адны на два гады. Жанчынам прапануецца знасіць за год чацвёра трусоў, сем пар калготак, а тры бюстгальтары трэба расцягнуць на тры гады. Хтосьці пагодзіцца, што ў актыўным гардэробе столькі і ёсць, а астатняе проста ляжыць у шафе.

Для жанчын прадугледжана наяўнасць аднаго халата на чатыры гады, дзвюх начных кашуль або піжам на тры гады.

На чатыры гады павінна хапіць па дзве пары туфляў і басаножак. Усяго ў мінімальным пераліку адзення для жанчын 31 пазіцыя.

ПАСПЕЦЬ ЗА ДЗЕЦЬМІ, ЯКІЯ РАСТУЦЬ

Хлопчыку ва ўзросце 13 гадоў належыць адну зімовую і адну дэмісезонную куртку насіць два гады. А вось дзяўчынка 7 гадоў, мяркуецца, расце хутчэй, ёй гэтай вопраткі павінна хапіць на паўтара года.

І хлопчыку, і дзяўчынцы «пакладзены» ў «кошык» адзін гарнітур, адны джынсы на год. Усе віды абутку, уключаючы красоўкі, — па адной пары на год, для хлопчыкаў толькі не прадугледжаны летнія туфлі. У бялізнавай групе таксама ўсё супадае: на год — чацвёра трусоў.

Мяркуецца, што за паўтара года хлопчыкі вырастуць з чатырох кашуль, з аднаго спартыўнага касцюма. Для дзяўчынак на паўтара года прадугледжана па дзве спадніцы, блузкі і начныя кашулі.

А цяпер давайце ўспомнім баць-коўскі ажыятаж перад кожным новым навучальным годам. Нават калі дзіця не вырасла з леташняга касцюма, сустракаць у ім 1 верасня мала хто хоча.

БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ

З 1 мая адбылося чарговае павышэнне памеру бюджэту пражыткovага мінімуму, у сярэднім на душу насельніцтва ён складае 352,13 руб.

БПМ для працаздольнага насельніцтва складае 389,53 руб. (раней — 377,14 руб.); для пенсіянераў — 265,96 руб. (256,7 руб.); дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 224,26 руб. (217,39 руб.); дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 308,56 руб. (300,03 руб.); дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 378,15 руб. (365,76 руб.).

МЫЕМ І ЧЫСЦІМ

Усё для той жа сям'і з чатырох чалавек прадугледжана 16 кг пральнага парашку і 3 літры вадкага сінтэтычнага мыйнага сродку на год.

Таблеткі для пасудамыечных машын або вадкасць для мыцця посуду, як і ўсялякія мыйныя сродкі для сантэхнікі, на жаль, не прадугледжаны.

Лічыцца, што на год сям'і дастаткова 3,5 літра шампуню, 12 цюбікаў зубной пасты па 75 грамаў, шасці цюбікаў крэму па 50 грамаў і столькі ж флаконаў дэзадаранту па 110 мілілітраў.

Туалетная папера, гігіенічныя пракладкі, як і лекі, прысутнічаюць у пераліку, але ніякіх рэкамендацый адносна ўмоўных нормаў спажывання гэтых прадметаў няма.

КОЛЬКІ ГАДОЎ АДМЕРАНА ШАФЕ?

Даволі вялікі пералік — мэбля, прадметы культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння: ад кухоннага гарнітура (адзін на 20 гадоў) да швейных іголак (адна ўпакоўка на пяць гадоў). Тэрмін замены, а значыць, жыцця практычна ўсёй мэблі вызначаны ў 20 гадоў. Савецкая мэбля жыла і больш, сучасная — ёсць сумненні. А яшчэ маральнае старэнне...

Кожнаму члену нашай умоўнай сям'і прапануюць 15 гадоў карыстацца адной падушкай і коўдрай. Прасцін, навалачак і падкоўдранікаў на ўсіх прадугледжана па два камплекты на пяць гадоў. Кухонных ручнікоў — усяго чатыры на два гады, лазневых — па адным на кожнага члена сям'і на пяць гадоў. Ручнікоў, скажам шчыра, замала, асабліва кухонных. А вось з двума камплектамі пасцельнай бялізны лёгка змірыцца, і ў шафе больш прасторна. Сумнеўна, праўда, што сучасныя падушкі і коўдры «пражываюць» 15 гадоў.

За пяць гадоў можна разбіць 16 талерак, а вось васьмі кубкаў са сподачкамі павінна хапіць на два гады.

Раз у дзесяць гадоў належыць мяняць халадзільнік, пральную машыну, тэлевізар, пыласос, прас. Раз у пяць гадоў прапануюць мяняць сотавы тэлефон. Спрэчна.

ІНТЭРНЭТ УЖО НЕ РАСКОША?

У наборы жыллёва-камунальных паслуг указаны наступныя жыллёвыя ўмовы — 48 кв. м.

Культурна-асветныя мерапрыемствы і адпачынак — ёсць, але тут нічога не рэгламентуецца: колькі разоў схадзіць у кіно ці колькі купіць кніг.

Бытавыя паслугі таксама не надта канкрэтызаваныя, лідзіруюць такія пазіцыі, як цырульня, гарадскі транспарт, аплата стацыянарнай, мабільнай сувязі і інтэрнэту.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

ВАЛАНЦЁРСТВА БЫВАЕ РОЗНЫМ

Семінар «Найлепшы досвед і практыка супрацоўніцтва на мясцовым узроўні па развіцці экатурызму на асабліва ахоўных тэрыторыях», які рэалізоўваецца ў рамках праекта ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды, прайшоў у Валожыне. У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўнікі некалькіх ААПТ, прадстаўнікі Валожынскага выканкама, мясцовага музея і аграсядзіб. Экспертамі і асноўнымі дакладчыкамі выступілі расійскія спецыялісты — Яўгенія Лёшына з экацэнтра «Запаведнікі» і Вольга Юрчанка з Алтайскага біясфернага запаведніка.

Калегі з Расіі падзяліліся вопытам арганізацыі валанцёрскага руху, абазначылі асноўныя моманты, на якія варта звяртаць увагу на падрыхтоўчым этапе, а потым і падчас правядзення розных акцый. Як распавяла Яўгенія Лёшына, формы валанцёрства могуць быць розныя: індывідуальнае, групавое, карпаратыўнае. Для кожнай вызначаюцца свае мэты, задачы і формы супрацоўніцтва. Але пры гэтым неабходна разумець, валанцёрства — гэта не дармавая працоўная сіла, а добраахвотны ўдзел у экалагічнай дзейнасці матываваных людзей. Патэнцыял валанцёраў не абмяжоўваецца толькі прыборкай, капаннем ці афарбоўкай. Сярод ахвотных бязвыплатна дапамагчы роднай прыродзе дастаткова шмат спецыялістаў, веды і ўменні якіх можна з большай карысцю выкарыстоўваць на развіццё ААПТ. Адзін з прыкладаў такой працы — распрацоўка валанцёрамі сайтаў і вядзенне сацсетак нацпаркаў.

Уцягванне мясцовых жыхароў у сферу экатурызму таксама з'яўляецца важным элементам эфектыўнага кіравання ААПТ. Праграмы лаяльнасці і розныя сумесныя праекты дазваляюць выбудаваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва. Мясцовае насельніцтва асвойвае новыя віды дзейнасці, узнікаюць дадатковыя працоўныя месцы. Экаасветніцкая работа, якая праводзіцца супрацоўнікамі ААПТ, садзейнічае разуменню мясцовымі жыхарамі ролі запаведнай тэрыторыі, асабліваслуў прававога рэжыму аховы, правілаў паводзін, што, у сваю чаргу, уплывае на скарачэнне колькасці правапарушэнняў.

«Валанцёрства — ідэя добрая, — адзначыў **дырэктар заказніка «Налібоцкі» Уладзімір АЛІСЕЙКА**, які ўдзельнічаў у семінары. — Але ў адрозненне ад Расіі ў нас, як правіла, распаўсюджаны аднадзённыя мерапрыемствы. Транспартная даступнасць і не такія, як у суседзяў, адлегласці дазваляюць людзям, напрыклад, раніцай прыехаць у Налібоцкую пушчу, дзень папрацаваць, а ўвечары ўжо дома піць гарбату. У той жа час каштоўнасць семінара менавіта ў абмене практычным досведам з калегамі, новымі прапановамі. Для мяне было цікава даведацца пра такую форму валанцёрства, як фатаграфаванне. Гэта калі прафесіянал здымае жывёл ці ландшафты пушчы і дублі здымкаў перадае дырэкцыі заказніка, якія яна можа бязвыплатна выкарыстоўваць у сваёй рабоце. Буду рады, калі ў нас з'явяцца такія прапановы з боку фатографаў».

Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор публичных торгов (аукциона)	ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by
Продавец	ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102
Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)	Извещение о проведении публичных электронных торгов опубликовано 29.03.2023 в газете «Звязда» № 59 (29939), стр. 11

Первые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области

Предмет публичных торгов (аукциона)

Лот №	Наименование	Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС	Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС
1	Здание склада и склад металлической тары, корпус № 106 и № 106А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102	869 281,20	579 520,80
2	Хозяйственный участок № 97А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102	257 774,40	171 849,60
3	Хозяйственно-складской участок № 76, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102	44 064,00	29 376,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг электронных торгов – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту его вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит до 500 тыс. белорусских рублей, 1 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит свыше 500 тыс. белорусских рублей в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Дата и время проведения торгов (аукциона): 05.06.2023 г., начало торгов – 10.00, окончание торгов – 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 02.06.2023 г. до 15.00**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже не завершенных строительством жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

Лот №1. Не завершенный строительством законсервированный жилой дом (срок консервации истек) с инв. № 250/U-42943 (фундамент – бетон, площадь застройки – 206 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 223887000601000437 площадью 0,1132 га для строительства и обслуживания жилого дома в частную собственность по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экимانский с/с, д. Бельчица, ул. Светлая, 40.
Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. не завершенного строительством жилого дома / зем. участка): **14 849,37** (7717,77 / 7131,60) бел. руб.
Задаток: 1484,93 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 51,97 %.
Реквизиты для внесения задатка: р/с: BY53AKBB36040000001972300000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300076187, код операции 40901. Получатель платежа: Экимانский сельисполком

Дата, время и место проведения аукциона: **20.06.2023 в 11.30 по адресу:** Витебская обл., г. Полоцк, пр-т Франциска Скорины, д.10 (малый зал корпуса № 2 Полоцкого районного исполнительного комитета). Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 19.05.2023 до 17.30 19.06.2023. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в течение двух месяцев обратиться за государственной регистрацией прав на земельный участок и уточнением его целевого назначения в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; в течение 6 месяцев со дня государственной регистрации прав на зем. участок получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные законодательством РБ. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества:** земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированной жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.

Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. **Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПЕРЕНОСЕ ДАТЫ ТОРГОВ

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает об изменении даты аукциона, назначенного на 06.06.2023, **по продаже права заключения договора аренды здания магазина (622/С-18900) общ. пл. 377,6 кв. м в г. Столбцы, ул. Гагарина, 82а.** Арендодатель – Столбцовский филиал Минского областного потребительского общества.

Дата торгов переносится с 06.06.2023 на 08.06.2023. Аукцион состоится **08.06.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.06.2023** до **16.00** по указанному адресу.
Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.

УНП 600037767

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 20 июня 2023 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже транспортного средства – погрузчика ТО-28А, принадлежащего унитарному предприятию «Металлургсоцсервис» на праве хозяйственного ведования

Лот № 1	**Погрузчик ТО-28А, регистрационный знак ЕА 2160, год выпуска 1999.** Цвет: оранжевый. Заводской номер: 143. Двигатель: дизель, 148 л. с. Коробка передач: механическая. Минимальная вместимость основного ковша: 2,2 куб. м. Допустимая масса: 12 200 кг. **Начальная цена лота: 25 281,60 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 1000,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Местонахождение автотранспортного средства: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Промышленная, 37

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6,** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 19.06.2023 г. включительно.**
Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **20.06.2023 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
